KULTURA-INFO.BY

КУЛЬТУРА

Дзе шукаць сапраўдныя цымбалы? Гук мінулага ў сучаснасці 5

Што аб'ядноўвае сэрцы і лечыць душы? Гаючая атмасфера брэндавых свят 8

Аповед пра тое, як заўсёды заставацца чалавекам 13

Андрэй Хрулёў

штотыднёвая грамадска-палітычная газета | выдаецца з кастрычніка 1991 года | № 32 (1628) | 18 жніўня 2023 г.

## Да навучальнага года гатовыя?

Класы, залы, сталовыя — у норме? У краіне ідзе праверка гатоўнасці ўстаноў адукацыі да новага навучальнага года. Так, міністр культуры Анатолій Маркевіч, яго намеснік Сяргей Саракач і начальнік аддзела ўстаноў адукацыі Марына Юркевіч наведалі каледжы і ВНУ, падпарадкаваныя Міністэрству культуры. Прадстаўнікі ведамства азнаёміліся са станам будынкаў і памяшканняў, з узроўнем арганізацыі і якасцю рамонтных работ, планамі на капітальны рамонт у 2024 годзе і з іншымі важнымі пытаннямі.

## Летні шанц — не ўпусціць!

Цыкл летніх канцэртаў "Губернатарскі сад" працягваецца: 19 жніўня ў Аляксандраўскім скверы выступіць Беларускі дзяржаўны акадэмічны заслужаны харэаграфічны ансамбль "Харошкі".

З 3 чэрвеня па 9 верасня штосуботу каля Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы ладзяцца імпрэзы. Адноўленую Міністэрствам культуры традыцыю праводзіць канцэрты ў гарадскіх парках падтрымалі найлепшыя выканаўцы і творчыя калектывы.

Заўтра праграмай са свайго залатога фонду "Харошкі" адкрыюць 50-ы сезон і падораць гледачам добры настрой. Уваход вольны!

Падчас свята ў Нясвіжы. Фота БелТА

# Дакрануцца да яркай гісторыі

Нясвіж з размахам адсвяткаваў 800-годдзе, у чарговы раз паказаўшы магутны культурны і творчы патэнцыял. Недарма ў віншавальным адрасе Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з нагоды юбілею адзначана, што "Нясвіж — горад-легенда, калыска беларускага кнігадрукавання, тэатральнага і музычнага мастацтва, каштоўная жамчужына на карце Беларусі. Яго архітэктурную прыгажосць і культурныя багацці стагоддзямі стваралі многія пакаленні нашых продкаў. Штогод сюды накіроўваюцца сотні тысяч турыстаў, каб дакрануцца да самабытнай і яркай гісторыі мудрага, таленавітага і працавітага беларускага народа".

Такія якасці жыхары славутага краю ў поўнай меры прадэманстравалі і падчас урачыстасцей. Адметнасць свята заключалася ў тым, што яно было падрыхтавана выключна сіламі раёна. Свае таленты праявілі аматарскія калектывы ўстаноў культуры і адукацыі. Непасрэднымі ўдзельнікамі праграмы сталі работнікі мясцовых арганізацый — здавалася б, гэта звычайныя людзі, але на Дзень горада яны ператварыліся ў сапраўдных артыстаў.

Працяг на стар. 4

Дзе ж стаяў летапісны Менск? Археалагічнае пытанне нацыянальнага значэння

стар. 6 ►

Фота з сайта president.gov.by

# З клопатам пра маладых і сталых

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 15 жніўня падпісаў Указ № 259 “Аб павышэнні пенсій”, а 9 жніўня — распараджэнне аб фінансаванні расходаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі.**

У адпаведнасці з указам усе віды працоўных пенсій павялічацца з 1 верасня. Вырастуць выплаты па ўзросце, за выслугу гадоў, па інваліднасці, па страце карміцеля — у сярэднім на 5 %.

Памер павышэння ў кожнага пенсіянера будзе свой у залежнасці ад стажу і былога заработку, узятых пад увагу пры вылічэнні пенсіі, а таксама ў залежнасці ад устаноўленых даплат да асноўнай пенсіі. Сярэдняя пенсія па ўзросце для асобы, якая не працуе, складзе 737 рублёў і павялічыцца на 15 % у адносінах да верасня мінулага года — такую папярэднюю ацэнку дало Мінпрацы і сацабароны.

На выплату пенсій будзе накіравана 1,7 млрд рублёў, з іх дадатковыя расходы ў сувязі з павышэннем па ўказе складуць 72 млн рублёў. Зараз працоўныя пенсіі атрымлівае больш за 2,3 млн чалавек.

Сёлета гэта ўжо другое павелічэнне працоўных пенсій. Папярэдні пераразлік быў 1 мая. Тады павышэнне склала таксама 5 %. Дарэчы, з 1 жніўня выраслі і сацыяльныя пенсіі. Яны прызначаны для людзей з інваліднасцю і дзяцей-інвалідаў — а такіх каля 75 тыс. чалавек.

Што тычыцца таленавітай моладзі і творчых калектываў, на іх падтрымку са спецфонду Прэзідэнта выдзеляць больш за 130 тыс. рублёў. Усяго ж сёлета на гэтыя мэты накіравана 740 тыс. рублёў з рэспубліканскага бюджэту за кошт сродкаў рэзервовага фонду Прэзідэнта.

У адпаведнасці з распараджэннем, падпісаным 9 жніўня, падтрымаюць 33 прадстаўнікоў таленавітай моладзі і 5 творчых калектываў — пераможцаў міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў і фестываляў.

Гэтае распараджэнне Кіраўніка дзяржавы спрыяе забеспячэнню ўмоў для пошуку, развіцця і навучання таленавітых юнакоў і дзяўчат, стымулявання іх творчай актыўнасці, прафесійнага росту і станаўлення.

## Выконваецца!

Чарговая апаратная нарада першага намесніка міністра культуры Рэспублікі Беларусь Валерыя Грамады з начальнікамі ўпраўленняў і аддзелаў ведамства адбылася 15 жніўня. Дзякуючы сродкам відэасувязі, у пасяджэнні паўдзельнічалі таксама начальнікі ўпраўленняў культуры абласных выканаўчых камітэтаў.

Начальнік упраўлення культуры і народнай творчасці Ірына Карповіч выступіла з дакладам аб ходзе выканання мэтавых паказчыкаў Дзяржаўнай праграмы “Культура Беларусі” на 2021—2025 гады па выніках першага паўгоддзя. Выконваюцца і перавыконваюцца паказчыкі па колькасці помнікаў архітэктуры, якія раней не выкарыстоўваліся і былі прыстасаваны пад сучасныя патрэбы, па колькасці нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, уключаных у Дзяржаўны спіс, па ліку наведванняў бібліятэк і музеяў на тысячу чалавек насельніцтва, ліку культурных мерапрыемстваў з удзелам творчых калектываў нацыянальна-культурных аб’яднанняў, ліку спектакляў, канцэртаў і прадстаўленняў, якія праводзяцца тэатральна-відовішчнымі арганізацыямі, а таксама іх наведванняў.

Тое ж тычыцца і паказчыкаў па долі фільмаў беларускай вытворчасці ад агульнай колькасці, па аб’ёме даходу ад паказаў ды іншых паслуг кінапракатных арганізацый, па колькасці мерапрыемстваў, якія ладзяцца клубнымі арганізацыямі і арганізацыямі змешанага тыпу, і па аб’ёме наведвання такіх імпрэз, а таксама па долі насельніцтва, уцягнутага ў дзейнасць клубных фарміраванняў, па долі алічбаваных музейных прадметаў і кінафонду. Асобным рэгіёнам было ўказана на неабходнасць своечасовага выканання шэрага мэтавых паказчыкаў.

На нарадзе таксама разглядалася падрыхтоўка да святкавання 2 верасня Дня беларускага пісьменства, да Беларуска-ўзбекскага форуму, які пройдзе 5 верасня ў Мінску, да фіналу конкурсу “Міс Беларусь”, што правядуць 8 верасня, і да мерапрыемстваў з нагоды Дня народнага адзінства, які адзначаецца 17 верасня.

# Дзе пакаштаваць “Бацькавай булкі”?

**Заўтра, 19 жніўня, у горадзе Свіслачы, што на Гродзеншчыне, пройдзе ўнікальны каравай-фэст “Бацькава булка”.**

Ідэя свята зарадзілася пасля таго, як Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка наведаў у Свіслачы прадпрыемства па вытворчасці хлебабулачных вырабаў. Пакаштаваўшы пляцёнку, спечаную па традыцыйным рэцэпце, якога тут прытрымліваюцца доўгія гады, Кіраўнік дзяржавы быў уражаны вытанчаным смакам і адзначыў, што булка нагадвае яму тую самую — з дзяцінства.

Пасля візіту Прэзідэнта мясцовая пляцёнка стала настолькі папулярнай, што яе вырашылі афіцыйна назваць “Бацькавай булкай”. А ўзнікненне ў Свіслачы аднайменнага фестывалю аказалася цалкам заканамерным.

— На сёння гэтае свята ўключана ў план абласных культурна-масавых мерапрыемстваў, таму мы надаём самую пільную ўвагу ўсім этапам арганізацыі і правядзення “Бацькавай булкі” ў Свіслачы, — адзначыла начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама Алена Клімовіч. — Гасцей мерапрыемства чакае захапляльная культурна-забаўляльная праграма, бо і абласныя, і раённыя ўлады імкнуліся зрабіць з “Бацькавай булкі” маштабную і яркую падзею, скіраваную на развіццё сучаснай беларускай культуры і папулярызацыю традыцыйных абрадаў і звычаяў.

Заўтра жыхары горада і госці фестывалю ўбачаць выставу конкурсных работ “Хлебныя шэдэўры”, на якой прафесійныя пекары прадэманструюць незвычайныя творы. На яшчэ адной выставе “Матулін каравай” свае дасягненні пакажуць ужо аматары. Таксама госці змогуць наведаць і экскурсію “Ад зерня да хлеба”, падчас якой пазнаёмяцца з этапамі стварэння галоўнага прадукту, а напрыканцы ўсіх чакае пачастунак — “Бацькава булка”.

Сярод навінак свята — прэзентацыя элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, звязанай з традыцыйнымі хлебнымі абрадамі Беларусі. Таксама можа будзе завітаць на пляцоўку экстрыму “Асілак”. Запланаваны выступленні кіроўцаў-механізатараў, якія пакажуць сваё майстэрства. Яшчэ адна навінка — “Булка-байкер-шоу” — паказальныя выступленні байкерскіх клубаў Гродзенскай і Брэсцкай абласцей.

І гэта, канечне, малая частка таго, што можна будзе ўбачыць у Свіслачы. Падрабязней пра ўсе цікавінкі “Бацькавай булкі” — у наступным нумары.

# Па свята — у Гарадок

**Да XXX Дня беларускага пісьменства засталося два тыдні. Урачыстасці разгорнуцца 2 і 3 верасня ў Гарадку.**

Сімвалічна, што юбілейны форум праходзіць на Віцебшчыне. На гэтых землях нарадзіліся Ефрасіння Полацкая, Францыск Скарына, Сімён Полацкі, Васіль Цяпінскі, што далі імпульс развіццю беларускай культуры, адукацыі, кнігадрукавання. Сярод акцэнтаў свята таксама — стварэнне паэмы “Тарас на Парнасе” выхадцам з Гарадоцкага раёна Канстанцінам Вераніцыным, юбілей беларускага пісьменніка, перакладчыка і драматурга Янкі Маўра, 140-годдзе з дня нараджэння якога сёлета адзначаецца, гісторыя, культура і традыцыі Гарадоччыны. З улікам гэтых тэм Міністэрства інфармацыі сумесна з Міністэрствам культуры і распрацоўвала праграму мерапрыемстваў.

Традыцыйна ў ёй — урачыстая цырымонія адкрыцця Дня беларускага пісьменства і ўзнагароджання пераможцаў Нацыянальнай літаратурнай прэміі, міжнародны круглы стол з удзелам айчынных і замежных пісьменнікаў, навукова-практычная канферэнцыя “Гарадоцкія чытанні”, дзіцячы конкурс “Жывая класіка”. У рамках свята пройдуць і навукова-асветніцкая канферэнцыя “Дарога да святыні”, Фестываль кнігі і прэсы. Будуць працаваць выставачныя і гандлёвыя павільёны.

Адметнай рысай юбілейнага форуму стануць эмацыўныя экспазіцыі гарадоў, дзе раней праводзіўся Дзень беларускага пісьменства. Парадуе гасцей і канцэрт, прысвечаны 85-годдзю кампазітара, народнага артыста Беларусі і СССР Ігара Лучанка, і выступленні мясцовых творчых калектываў.

Падрыхтоўка да свята ідзе поўным ходам. Разам з адмысловцамі працуе моладзь. Так, студэнты Акадэміі мастацтваў выточваюць фігуры з каменю, якія ўпрыгожаць сквер. Работнікі гарадоцкіх устаноў культуры і адукацыі ствараюць муралы: фасады дамоў аздобяць цытаты беларускіх пісьменнікаў і паэтаў. Гасцей і жыхароў горада чакае шмат іншых сюрпрызаў. Якіх? Хутка даведаемся.



У Палацы Незалежнасці з’явіўся новы экспанат — першы каравай сезона-2023.

Падчас пасяджэння

# Рыхтуючыся сустракаць гасцей

**Нарада, прысвечаная арганізацыі IV Фестывалю мастацтваў беларусаў свету, адбылася ў Міністэрстве культуры 11 жніўня. У пасяджэнні паўдзельнічала кіраўнік рабочай групы па справах беларусаў замежжа Нацыянальнага сходу Валянціна Ражанец.**

Форум ладзіцца адзін раз на тры гады. Сёлета падзея пройдзе ў Мінску і рэгіёнах з 19 па 24 верасня. Арганізатарамі выступаюць Міністэрства культуры і Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур пры садзейнічанні ўпаўнаважанага на справах рэлігій і нацыянальнасцей і Міністэрства замежных спраў. Мэта фестывалю — прэзентацыя дасягненняў нашай краіны і падтрымка творчых праектаў беларусаў замежжа, а таксама актывізацыя культурных сувязей з беларускай дыяспарай.

На імпрэзу запрошаны творчыя калектывы мастацкай самадзейнасці, сольныя выканаўцы, мастакі, скульптары, дызайнеры, майстры народных промыслаў, фатографы і паэты. Усяго да форуму далучыцца каля 250 чалавек з усяго свету. Удзел пацвердзілі прадстаўнікі Арменіі, Злучаных Штатаў Амерыкі, Іспаніі, Італіі, Казахстана, Латвіі, Літвы, Расійскай Федэрацыі і Эстоніі, а нашы суайчыннікі з Аргенціны, Іарданіі падключацца па відэасувязі.

У праграме фестывалю — канцэрты беларускай фальклорнай і сучаснай музыкі, выставы жывапісу, фота і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, творчыя сустрэчы з кіраўнікамі і чальцамі Саюза пісьменнікаў Беларусі, Беларускага саюза мастакоў, Беларускага саюза майстроў народнай творчасці. У сталічным храме ў гонар Усіх Святых 20 верасня правядуць дыялогавую пляцоўку “Беларусь — краіна яднання”, а цырымонія ўрачыстага адкрыцця форуму запланавана 21 верасня ў Мінскім гарадскім палацы культуры. Падчас канцэрта беларусы свету прадставяць творчыя нумары як самастойна, так і сумесна з артыстамі айчыннай эстрады.

У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў 22 верасня пройдуць майстар-класы ў межах свята. Акрамя таго, удзельнікі фестывалю наведаюць мемарыяльныя комплексы ў Хатыні і Трасцянцы, урачыста ўскладуць кветкі. 23 верасня мяркуюцца выезды ў рэгіёны — адбудуцца экскурсіі, майстар-класы і канцэртныя праграмы. На Брэстчыне беларусы замежжа завітаюць у Косаўскі палацава-паркавы ансамбль і на музейную экспазіцыю ў Бярозе, прысвечаную гісторыі канцэнтрацыйнага лагера 1934—1939 гадоў, а таксама ў Пружаны. У Віцебскай вобласці гасцей будзе прымаць Аршанскі раён, у Гомельскай — Светлагорскі, у Гродзенскай — Лідскі, у Магілёўскай — Клічаўскі, а ў Мінскай — Слуцкі.

# Знайсці ўласную “фішку”

**Сучасную працу культурна-дасугавых устаноў па прасоўванні рэгіянальных брэндаў абмеркавалі на рэспубліканскім семінары-практыкуме, які прынялі арганізацыі Іванаўскага раёна і Пінска.**

Дэманстрацыя абраду “Выкуп скрыні”

Удзельнікам найперш прапанавалі заглыбіцца ў праграму Міжнароднага фестывалю фальклору “Мотальскія прысмакі”. Работнікі ўстаноў культуры выправіліся вывучаць вопыт калег на шматлікія святочныя пляцоўкі: наведалі тэатралізаванае шэсце і ўрачыстае адкрыццё, азнаёміліся з выставачнымі падворкамі рамеснікаў, далучыліся да майстар-класаў. Асаблівую ўвагу прыцягнулі прэзентацыі каляндарных і сямейных абрадаў розных мясцовасцей. Таксама ўдзельнікі семінара завіталі ў Раённы музейны комплекс імя Напалеона Орды ў Варацэвічах, у ландшафтна-культурны парк мініяцюр страчаных аб’ектаў спадчыны ў Іванаве, у Музей Беларускага Палесся і ў кафедральны сабор у Пінску.

Пляцоўкай для абмену меркаваннямі стаў эматыўны круглы стол, на якім гаварылі пра распрацоўку і функцыянаванне рэгіянальных брэндаў, патэнцыял развіцця гастранамічных мерапрыемстваў, эфектыўныя тэхналогіі маркетынгу.

Загадчык аддзела Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур Святлана Каржук засяродзіла ўвагу на гастранамічных святах і фестывалях нашай краіны. Іх выступоўца назвала перспектыўным кірункам сучаснага этнакультурнага адраджэння. Святлана Валянціnaўна зазначыла, што гастранамічныя мерапрыемствы дапамагаюць павысіць сацыяльную ўстойлівасць рэгіёна і істотна падтрымліваюць індустрыю. Такія імпрэзы з’яўляюцца важнай часткай брэндынгу розных мясцовасцей, фарміруюць у людзей жаданне наведаць менш папулярныя ў іншых адносінах геаграфічныя пункты. Для нашай краіны гэта даволі новы від турызму, які мае значны патэнцыял.

Загадчык сектара этналінгвістыкі і фальклору Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Алена Боганева падкрэсліла, што стравы як змястоўная частка абрадаў у сучаснай культурнай прасторы могуць выконваць ролю брэндаў пэўных лакальных або рэгіянальных традыцый. Алена Міхайлаўна таксама падрабязна распавяла аб старажытных абрадавых стравах беларусаў.

Прафесар кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці БДУКМ Алена Макарава спынілася на панящці брэнда і прапанавала рэкамендацыі па стварэнні спрыяльнага іміджу тавараў, паслуг і праграм. Даследчыца нагадала, што брэндынг даўно выйшаў за межы камерцыйнай сферы і набірае папулярнасць у сацыяльным і культурным жыцці.

## Асветніцкі тур

**Патрыятычная акцыя “Наш абавязак — памятаць” крочыць па краіне. Жыхары і госці розных гарадоў могуць наведаць мабільную экспазіцыю Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.**

Без перасоўнага музея ўжо складана ўявіць найбольш значныя масавыя мерапрыемствы ў рэгіёнах. Напрыклад, не абыходзіцца без яго культурна-спартыўны фестываль “Вытокі. Крок да Алімпа”. Днямі дакументы і матэрыялы з фондавых калекцый прэзентавалі на святкаванні 800-годдзя Нясвіжа. Раней мабільная экспазіцыя завітала ў Слуцк, Брэст, Слонім, Маладзечна, Баранавічы і дзясяткі іншых населеных пунктаў.

Асноўная частка выставы складаецца з трох раздзелаў. Першы прысвечаны абарончым баям у 1941—1942 гадах. Другі раскрывае гісторыю падпольнай і партызанскай барацьбы на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Трэці расказвае аб вызваленні нашай рэспублікі і Еўропы, разгроме Германіі.

Увазе наведвальнікаў прапанаваны сюжэтныя фатаграфіі, копіі дакументаў і плакатаў, рэпрадукцыі карцін, фотапартрэты Герояў Савецкага Саюза, якія здзейснілі подзвігі на беларускай зямлі. У вітрынах паказаны муляжы зброі, а таксама асабістыя рэчы байцоў Чырвонай арміі і партызан.

Падчас паездак супрацоўнікі музея не толькі ладзяць экскурсіі, але і збіраюць матэрыялы аб генацыдзе беларускага народа, прадметы, звязаныя з удзельнікамі партызанскага і падпольнага руху, франтавых дзеянняў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

## Ніколі не позна

**Тэлепраект “Фактар.by 60+” вяртаецца на экраны.**

Ахвотным паўдзельнічаць у перадачы, якія не трапілі на жывыя праслухоўванні, Белтэлерадыёкампанія дае магчымасць далучыцца праз Сецяа. Даслаць заяўку можна на афіцыйным сайце медыяхолдынга. Для гэтага неабходна запоўніць анкету і дабавіць відэа акапэльнага выканання музычнай кампазіцыі. Атрымаць актуальную інфармацыю аб шоу можна ў тэле- і радыёэфіры, на партале tvr.by і старонках праекта ў сацыяльных сетках.



Фінал конкурсу “Міс Беларусь — 2023” адбудзецца 8 верасня.

# Як Нясвіж збіраў сяброў

## Сакрэты вялікага свята і адной рэжысёрскай задумы

**Як апісаць усё, што падрыхтаваў старадаўні Нясвіж да адзначэння свайго 800-годдзя? Гэта папросту немагчыма. Ужо з раніцы тут пачалі працаваць тэматычныя пляцоўкі, якіх у праграме значылася аж 15! Да юбілею цэнтр горада ператварыўся ў пешаходную зону. Гэтая грамадска-культурная прастора знаёміла гасцей з дасягненнямі славутага краю.**

На Савецкай вуліцы былі даступныя гандлёвыя рады і экспазіцыя ўстаноў Мінскай вобласці, на Ленінскай — "Галерэя рамёстваў", на Слуцкай — прэзентацыі прадпрыемстваў горада і раёна. У скверы ля ратушы разгарнуліся выставы мастакоў і фатографаў. Каля помніка асветніку Сымону Будналу падводзіліся вынікі міжнароднага літаратурнага анлайн-конкурсу, выступалі паэты, пісьменнікі і чытальнікі, працавалі інтэрактыўныя пляцоўкі бібліятэк.

У палацы Радзівілаў Мінская школа фларыстыкі арганізавала фестываль кветак. Усім ахвочым прапаноўвалі паўдзельнічаць у майстар-класах па вырабе біжутэрыі з раслін і саломы. Прайшоў яркі і маляўнічы паказ моды, на якім прадэманстравалі кветачныя кампазіцыі.

У Англійскім парку зладзілі фестываль гістарычных рэканструкцый "Нясвіжская фартэцыя", які доўжыўся ўвесь дзень і складаўся з некалькіх этапаў. Наведвальнікі ўбачылі сярэднявечнае спаборніцтва лучнікаў, рыцарскі конны турнір, паказальнае выступленне шатландскай пяхоты, рэканструкцыю эпізоду вайны 1812 года і Першай сусветнай.

Жыхары і госці горада з задавальненнем удзельнічалі ў першым фестывалі сыру "СЫРароб". Прадукцыю прадставілі гаспадаркі Нясвіжскага раёна, Слуцкі сыраробны камбінат і Мінскі малаказавод № 1. Сярод фермераў прайшоў конкурс на самы смачны сыр у некалькіх намінацыях: мяккі, паўцвёрды, цвёрды, з казінага малака.

На Замкавай сажалцы правялі паказальныя выступленні па парусным спорце (віндсерфінг, швертбот класа "Лазер"). Прыцягвалі наведвальнікаў інтэрактыўныя пляцоўкі МНС і Дэпартамента аховы МУС.

Усім гэтым можна было палюбавацца з вышыні. З самай раніцы неба над горадам баразнілі судны Бабруйскага аэраклуба з аматарамі вострых адчуванняў на бартах. Мяркуючы па гуле вінтоў пад аблокамі, што практычна не спыняўся, недахопу ў ахвочых палётаць хутчэй за вецер не было.

Важнай падзеяй, прымеркаванай да юбілею горада, стала адкрыццё новай раённай паліклінікі. Ва ўрачыстасці паўдзельнічалі старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр Турчын і міністр аховы здароўя Дзмітрый Піневіч.

Звярнуў на сябе ўвагу парад стылізаванай тэхнікі "Нясвіж: 800 гадоў у дарозе". Прадпрыемствы і арганізацыі горада афармілі своеасаблівыя фотазоны на машынах. У пачатку аўтакалоны ішла ладдзя з рыцарамі. Сярод тэхнікі была платформа, якая адлюстроўвала падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Дэманстраваліся і маляўнічыя інсталяцыі на тэмы сучаснага жыцця Нясвіжчыны: сельскай гаспадаркі, прамысловасці, адукацыі, культуры. Арыгінальнасцю вылучаліся аўтаплатформы мясцовага хлебазавода і навучальных устаноў краю.

Увечары святочная праграма працягнулася ўрачыстасцямі і канцэртам на Ратушнай плошчы. З юбілеем Нясвіж павітаў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Луцкі, які таксама агучыў віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі. Прывітальны адрас міністра культуры Анатолія Маркевіча зачытаў яго першы намеснік Валерый Грамада.

Прагучалі віншаванні ад абласнога і раённага кіраўніцтва. У іх падкрэслівалася сучаснае значэнне Нясвіжа ў многіх сферах эканомікі і культуры, быў ацэнены вялікі ўклад жыхароў горада, якія талентам, працавітасцю і патрыятызмам зрабілі гэты край вядомым і квітнеючым. Найлепшых прадстаўнікоў розных галін узнагародзілі на галоўнай сцэне свята.

Кульмінацыяй урачыстасцей стаў тэатралізаваны пралог канцэрта "Нясвіж збірае сяброў". Праграму пачаў паланэз — танцавалі адначасова каля ста чалавек! Супрацоўнікі арганізацый і навучэнцы ўстаноў адукацыі горада больш за месяц рыхтаваліся да выступлення пад кіраўніцтвам нясвіжскага харэографа Кацярыны Лабаза. І вынік — выдатны!

Усе — і дарослыя, і дзеці — былі рады паказаць увесь багаты культурны патэнцыял Нясвіжчыны. Гэткая рэжысёрская задума — сваімі сіламі павіншаваць горад.

Нясвіж заўсёды славіўся балямі. Яны былі абавязковай часткай любой урачыстасці. Мы вырашылі адрадзіць традыцыю і паднесці такі падарунак любімаму гораду. Харэограф Нясвіжскай дзіцячай школы мастацтваў Кацярына Рыгораўна Лабаза больш за месяц працавала над гэтым паланэзам.

**ЛЮДМІЛА ВІТКО,**
начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Нясвіжскага райвыканкама:

— Канцэртная праграма была прадстаўлена салістамі, творчымі калектывамі раёна — народнымі і ўзорнымі. У імпрэзе "Нясвіж збірае сяброў" таксама ўдзельнічалі артысты з Капыльскага, Дзяржынскага, Клецкага, Стаўбцоўскага, Слуцкага раёнаў Міншчыны. Выступалі і творчыя калектывы з расійскіх гарадоў-пабрацімаў Нясвіжа: Гатчыны, Рэўтава і Вялікага Ноўгарада. Мы мэтанакіравана зрабілі акцэнт на мясцовых артыстах, каб у значны юбілей паказаць увесь багаты культурны патэнцыял Нясвіжчыны. Гэткая рэжысёрская задума — сваімі сіламі павіншаваць горад.

Нясвіж заўсёды славіўся балямі. Яны былі абавязковай часткай любой урачыстасці. Мы вырашылі адрадзіць традыцыю і паднесці такі падарунак любімаму гораду. Харэограф Нясвіжскай дзіцячай школы мастацтваў Кацярына Рыгораўна Лабаза больш за месяц працавала над гэтым паланэзам.

1. Адкрыццё свята "Да роднага краю з любоўю"
2. Фестываль "Кветкі палаца"
3. Выстава кветачных дываноў
4. Фестываль гістарычных рэканструкцый "Нясвіжская фартэцыя"
5. Народны клуб аматараў песні, гумару, гульні "Вечарніца" Навасёлкаўскага СДК з Ляхавіцкага раёна
6. Удзельнікі ColorFest'у

# Музыка, што яднае пакаленні

## У чым сакрэт пастаўскіх цымбалаў?

**Беларуская рэспубліканская навукова-метадычная рада па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны 11 жніўня прыняла рашэнне аб неабходнасці надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці элементу "Традыцыйнае інструментальнае выкананне на дыятанічных цымбалах", які бытуе на тэрыторыі Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці.**

Прапанову аб прысваенні статусу падрыхтаваў Цэнтр культуры і народнай творчасці Пастаўскага раёна пры дапамозе Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і ўнесла ўпраўленне культуры Віцебскага аблвыканкама. На пасяджэнні былі заслуханы даклад вядучага навуковага супрацоўніка Цэнтра культуры і народнай творчасці Пастаўскага раёна Таццяны Карпавай і экспертнае заключэнне магістра мастацтваў, саісканьніка кафедры гісторыі музыкі і музычнай беларусістыкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Таццяны Бельмач. Таксама разглядалася экспертнае заключэнне прафесара Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, народнага артыста Беларусі Яўгена Гладкова.

### ГУКІ З МІНУЛАГА

Як адзначаюць знаўцы, традыцыйнае інструментальнае выканальніцтва на дыятанічных цымбалах — гэта максімальна дакладнае прайграванне музыкі мінулага, як яна гучала ў арыгінале. Цымбалы — адзін з найбольш старажытных запазычаных нашымі продкамі музычных інструментаў: яны, як сведчаць іканаграфічныя і літаратурныя крыніцы, прыйшлі ў Беларусь у пачатку XVI стагоддзя. Спецыфіка ігры на дыятанічных цымбалах праяўляецца ў дыскрэтнай прыродзе гуказдабывання, адсутнасці глушэння струн, у наяўнасці ў інструмента абертонаў, якія накладваюцца адзін на адзін, ва ўзнікненні акустычнага бурдона, што ўтварае непарыўны фон (таму і кажуць: "Цымбалы гудуць, шумяць, нібы жывыя"). Гук пастаўскіх цымбалаў адрозніваецца асаблівай звонкасцю, празрыстасцю і магутнасцю.

Дыятанічныя цымбалы — гэта аўтэнтычны музычны інструмент, які захаваў найбольш старажытны выгляд. Такія цымбалы маюць гукарад, што адпавядае традыцыйнай беларускай музыцы і дазваляе выконваць творы толькі ў адной або дзвюх дыятанічных гамах. Сучасныя ж храматычныя цымбалы — гэта рэканструяваны інструмент з павялічаным дыяпазонам, трапецападобнай формы, пастаўлены на тры ножкі і з храматычным ладам, як ва ўсіх акадэмічных музычных інструментаў, які дазваляе выконваць музыку ў любой танальнасці, розных стыляў, жанраў і кірункаў.

Важным фактарам, ад якога залежаць якасныя характарыстыкі інструментальнага гуку, з'яўляецца матэрыял. Для вырабу цымбалаў народныя майстры выкарыстоўваюць драбнаслойную елку або сасну, ліпу, а таксама дуб, клён, бярозу ці граб. У залежнасці ад уяўленняў аб эстэтыцы цымбальнага гуку кожны майстар кіруецца сваімі крытэрыямі пры нарыхтоўцы драўніны, улічваючы рэльеф мясцовасці, перыяд высечкі дрэва, яго ўзрост і многае іншае. Напрыклад, у ваколіцах Варапаева мяркуюць, што елка павінна расці ў вельмі дрэнных умовах, тады цымбальны гук будзе больш яркі. У адпаведнасці з характарыстыкамі за кожнай пародай дрэва замацавана бясспрэчнае пэўнае прызначэнне. Цвёрдая фактура дубу, грабу, клёну, бярозы падыходзіць для вырабу ўстойлівых канструкцый і дэталей — калёў для нацяжэння струн і рамы. А сасна і драбнаслойная елка валодаюць добрай гукаправоднасцю, высокімі рэзанёрнымі ўласцівасцямі — таму выкарыстоўваюцца для стварэння верхняй дэкі.

### МЯСЦОВЫ ГОНАР

Аналагаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь гэты элемент не мае. У розных рэгіёнах краіны цымбалы характарызуюцца сваімі памерамі, строем, дыяпазонам, колькасцю галаснікоў, радоў струн, іх колькасцю ў "хоры" (некалькі струн, што настройваюцца ва ўнісон). Усё гэта складае адметнасць той ці іншай лакальнай традыцыі.

Паводле вынікаў фальклорных экспедыцый 1984—1996 гадоў і зместак даследчыцы Альбіны Скорабагатчанкі, у Пастаўскім раёне існуюць дзве выканальніцкія школы народных музыкантаў: у Варапаеве і Груздаве. У мінулым гэтыя два населеныя пункты з'яўляліся значнымі культурнымі цэнтрамі, куды ў дні рэлігійных і свецкіх свят з'язджаліся на кірмашы людзі з усёй акругі. Прыбывалі туды і музыканты — прадаць або купіць інструменты і паспаборнічаць у майстэрстве ігры.

Дыятанічныя цымбалы вырабляюцца ў Пастаўскім раёне майстрамі Валянцінам Жагулам і Аляксандрам Пачкоўскім, раней таксама працавалі Восіп Новік (1908—1989) і Яўстафій Павініч (1927—2015). Там склаліся цэлыя музычныя дынастыі: Падгайскіх з Цешалава; Мацкевічаў, Новікаў і Мельцаў — з Пожарцаў; Крывенькіх — з Груздава і Ажарава; Крываносаў — з вёскі Біюці і іншыя. Многія музыканты добра гралі на некалькіх інструментах, вучылі гэтаму дзяцей у сям'і. Нашчадкі выканаўцаў захоўваюць звычаі і цяпер. Менавіта ў Паставах больш за 30 гадоў праходзіць фестываль народнай музыкі "Звіняць цымбалы і гармонік".

### БУДУЧЫНЯ ТРАДЫЦЫІ

На сённяшні дзень у Пастаўскім раёне Віцебскай вобласці налічваецца пяць носьбітаў і 17 пераемнікаў элемента гісторыка-культурнай спадчыны. Выкананне на дыятанічных цымбалах бытуе ў аграгарадках Дунілавічы, Варапаева і ў вёсцы Гута. Пры Пастаўскай дзіцячай школе мастацтваў імя Антоніна Тызенгаўза дзейнічае клас дыятанічных цымбалаў, таксама працуюць дзіцячы інструментальны ансамбль "Пастаўскія цымбалісты" і заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь "Паазер'е". У рэпертуары апошняга — найгрышы груздаўскіх музыкантаў: полькі "Шабасоўка", "Ражкоўская", "Рум", "Бежанка", "Петраградка", літоўскі вальс, вальсы "Восень", "Нінача", "Гармошка", кракавяк, мазурка, падэспань і іншыя. Традыцыя таксама працягваецца ў сям'і Мацкевічаў з Паставаў, элемент перадаецца ў мясцовай супольнасці музыкантаў ад пакалення да пакалення. У моладзі фарміруецца пачуццё самабытнасці, што садзейнічае развіццю павагі да культурнай разнастайнасці і творчасці.

У адпаведнасці з рашэннем Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны Віцебскаму аблвыканкаму і Пастаўскаму райвыканкаму рэкамендавана разгледзець пытанне аб забеспячэнні пераемнасці элемента ў частцы стварэння музычных інструментаў і падрыхтоўкі майстроў, якія займаюцца вырабам і настройкай дыятанічных цымбалаў, а таксама пастаянна распаўсюджваць і папулярызаваць гэтую традыцыю. Звычай мусіць быць уключаны ў рэгіянальныя комплексы мерапрыемстваў на 2021—2025 гады па захаванні нематэрыяльных праяў творчасці чалавека, унесеных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

**Антон РУДАК**
Фота Уладзіміра ШЛАПАКА

Носьбіты традыцыі з ансамбля "Паазер'е"

Дыятанічныя цымбалы — гэта аўтэнтычны музычны інструмент, які захаваў найбольш старажытны выгляд. Такія цымбалы маюць гукарад, што адпавядае традыцыйнай беларускай музыцы.

# Ажывіць сівыя эпохі

## Як ідуць раскопкі нацыянальнага значэння?

**Археалагічны комплекс на рацэ Менцы — за дзясятак кіламетраў на захад ад сталіцы. Яшчэ ў 1920-я гады з'явілася версія, што менавіта тут знаходзіўся летапісны Менск. Каб нарэшце пацвердзіць альбо абвергнуць гэтае меркаванне, Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ладзіць маштабныя раскопкі.**

Сярод удзельнікаў раскопак — студэнты-валанцёры

Яшчэ больш фота — у Telegram-канале

Пачаць даследаванне комплексу, каб устанавіць яго гісторыка-культурную ролю ў IX—XI стагоддзях і значэнне ў мінуўшчыне краіны, даручыў Прэм'ер-міністр **Раман Галоўчанка**. Ён зазначыў, наведаўшы помнік у верасні 2022-га: развіццю аб'екта ў вёсцы Гарадзішча неабходна надаць дынаміку і на аснове навуковых рэкамендацый скласці канцэпцыю комплекснага развіцця. Мяркуецца, што мясціна ператворыцца ў музей пад адкрытым небам, пляцоўку для імпрэз і навуковых форумаў — і стане новым брэндам Беларусі.

Таксама Савет Міністраў ухваліў і падтрымаў канцэпцыю фарміравання і рэалізацыі найбольш значных нацыянальных археалагічных праектаў. Па словах дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вадзіма Лакізы, акрамя помніка на Менцы, установа прапанавала ўнесці ў дакумент іншыя істотныя для гісторыі айчыннай дзяржаўнасці аб'екты. Напрыклад, стаянку эпохі палеаліту каля вёскі Агова Іванаўскага раёна. Падчас сумесных з расійскімі калегамі даследаванняў знойдзены артэфакты, якія сведчаць пра засяленне тэрыторыі Беларусі ў прамежку 250—200 тысяч гадоў таму. Унікальным з'яўляецца і комплекс на Крывінскім тарфяніку ў Бешанковіцкім і Сенненскім раёнах. Артэфакты, што захаваліся ў культурным пласце без доступу кіслароду, значна дапаўняюць уяўленні пра жыхароў нашых зямель у эпоху неаліту і ў бронзавым веку. На думку Вадзіма Лакізы, уключаныя ў канцэпцыю помнікі пасля добраўпарадкавання маглі б выкарыстоўвацца ў культурнай і турыстычнай сферах.

Мяркуецца, што археалагічны комплекс ператворыцца ў музей пад адкрытым небам, пляцоўку для імпрэз, навуковых форумаў — і стане новым брэндам Беларусі.

**Андрэй Вайцяховіч:**
"У X — першай палове XI стагоддзя паселішча з'яўлялася адным з самых вялікіх. Яно пачало фарміравацца як цэнтр славянскага рассялення".

### ЗНАХОДКІ Ў МІЖРЭЧЧЫ

У археалагічным комплексе на Менцы палявы сезон пачаўся ў красавіку інструментальнымі даследаваннямі, пазней стартавалі паўнавартасныя раскопкі. З таго часу выяўлена каля 300 індывідуальных знаходак і звыш 5 тыс. адзінак масавага керамічнага матэрыялу. Унікальныя артэфакты зараз можна ўбачыць на выставе "Падарожжа ў мінулае..." у Мінскай гарадской ратушы. Археолагі тым часам працягваюць пошукі.

— Мы зрабілі шэсць раскопаў. І калі вывучаць матэрыяльную культуру, то яна не сельская, а гарадская. Яна звязана з рамяством, — расказвае кіраўнік раскопак, загадчык аддзела Інстытута гісторыі НАН Андрэй Вайцяховіч. — За валамі мы адшукалі рэшткі ювелірнай майстэрні, якая функцыянавала ў XI — пачатку XII стагоддзя. Вельмі шмат ганчарных пломбаў розных старажытнарускіх княстваў. Знойдзены гіркі, манеты, арабскія пацеркі. Таксама ёсць сведчанні таго, што тут развівалася кастарэзнае і кавальскае рамяство. А сельскагаспадарчага інвентару вельмі мала.

Што да значнасці пасялення, Андрэй Вайцяховіч сцвярджае: яно было сапраўды буйным. Агульная плошча пасадаў складала 30 гектараў. Гэта дазваляе казаць, што ў X — першай палове XI стагоддзя паселішча з'яўлялася адным з самых вялікіх. Яно пачало фарміравацца як цэнтр славянскага рассялення. Плямёны з поўдня і паўднёвага ўсходу прыйшлі ў вярхоўі Пцічы на ўрадлівую зямлю, куды пазней хлынула хваля новых людзей.

Паказальны і той факт, што ў археалагічным комплексе адшукалі ўжо некалькі фрагментаў посуду з родавым знакам князя Ізяслава. Леташняя знаходка стала першай на тэрыторыі Беларусі з асабістай паметай славутай асобы. На думку кіраўніка раскопак, артэфакты могуць сведчыць, што ў гэтым месцы альбо правёў пэўны час сам Ізяслаў, альбо прысутнічалі яго прадстаўнікі, якія мелі права карыстацца знакам.

### АЦАНІЦЬ УЗРОСТ

Як мяркуецца, на мяжы I і II тысячагоддзяў нашай эры былі насыпаны валы, і паселішча на Менцы атрымала статус паўнацэннага горада. Каб дакладна ўстанавіць, калі створаны ўмацаванні, археолагі раскопваюць гэтыя вялізныя насыпы. У выніку адмыслоўцы павінны выйсці да самага падножжа. Там захаваліся асновы валоў — дубовыя клеці. Іх вывіў у 1983 годзе слынны навукоўца Георгій Штыхаў. Сучасныя даследчыкі маюць задачу раскрыць драўляныя элементы, узяць спілы і правесці дэндрахраналагічны аналіз. Раней такія дакладныя метады ў гэтым месцы не прымяняліся.

Удзельнікі раскопак рыдлёўкамі здымаюць пласты зямлі і тачкамі вывозяць грунт. Іншыя работнікі ўручную правяраюць, ці ёсць у ім артэфакты, адкладваюць знаходкі ў адмысловыя скрыні. Фрагменты керамікі пазней дбайна прамываюць. Перыядычна насыпы абследуюць з металашукальнікам. А часам рыдлёўкі даводзіцца пакідаць ды брацца за шуфлікі і пэндзлі.

### ДАПАМОГА АД МОЛАДЗІ

Разам з супрацоўнікамі Інстытута гісторыі НАН Беларусі ў раскопках удзельнічаюць валанцёры і студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, вышэйшых навучальных устаноў Брэста, Віцебска, Гомеля, Гродна, Магілёва, Полацка. Гэта каштоўная магчымасць для маладых людзей атрымаць навыкі, адкрыць для сябе новае месца на карце Беларусі і зрабіць унёсак у лёс важнага помніка.

— Гэта вельмі пазнавальна. І я ўпэўнена, што ўсім нашым хлопцам і дзяўчатам падабаецца, асабліва калі атрымліваецца нешта знайсці, — дзеліцца ўражаннямі камандзір студатрада Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта Анастасія Худзік. — Нядаўна трапіліся рэшткі вазы, і мы ўсе разам спрабавалі сабраць элементы, як мазаіку. Радаваліся, калі адшукалі нож. А пацеркі XI стагоддзя былі, напэўна, самай захапляльнай знаходкай. Як нам патлумачылі, іх часта прапускаюць і выкідаюць. Таму нам пашанцавала. Цікава, як выглядала ўпрыгажэнне цалкам, хто яго насіў і хто ўвогуле жыў на гэтым месцы.

Хоць адмыслоўцы ўжо атрымалі нямала артэфактаў, што дапаўняюць старонкі нашай гісторыі, цяперашняя археалагічныя работы — гэта толькі пачатак. Навукоўцаў чакае каласальная прастора для пошукаў. Сёлета раскопкі працягнуцца да халадоў.

**Даніл ШЭЙКА**
Фота Уладзіміра ШЛАПАКА

Мяркуецца, што археалагічны комплекс ператворыцца ў музей пад адкрытым небам, пляцоўку для імпрэз, навуковых форумаў — і стане новым брэндам Беларусі.



Дзень жывой археалогіі пройдзе ў Белавежскай пушчы 19 жніўня.



# Уладзіслава АРЦЮКОЎСКАЯ

мастацкі кіраўнік Маладзёжнага тэатра эстрады, драматург, рэжысёр, уладальнік ордэна Францыска Скарыны

Уладзіслава Іграўна Арцюкоўская нарадзілася 14 чэрвеня 1977 года ў Мінску. Навучалася ў сярэдняй школе № 136 з тэатральным ухілам, дзе выкладала актрыса і рэжысёр Антаніна Аксёнава. Ужо ў гэты час напісала моладзевую п'есу "Пакуль зоркі не растані", паставіла спектакль па ёй і атрымала прыз на дзіцячым фестывалі ў Брэсце.

Абаранне дыпломную работу на сцэне Маладзёжнага драматычнага тэатра. У 2000—2006 гадах працуе ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі. З 2006-га — галоўны рэжысёр буйных дзяржаўных святочных мерапрыемстваў, сярод якіх "Славянскі базар", "Галоўная ёлка краіны", балі выпускнікоў і інш. З чэрвеня брэнд-дырэктарам у выставачнай кампаніі, падзіны міжнародныя праекты.

З 2018-га па сёння — мастацкі кіраўнік Маладзёжнага тэатра эстрады, у якім дала жыццё шэрагу спектакляў. Сярод іх — мюзікл-прытча "Як ноч стала дзіўчынай", мюзікл-дэтэктыў "Джэк Патрашыцель", мюзікл "Бурлеск", імерсіўны мюзікл "Стрыпты душы", біяграфічны мюзікл "Гур'янаў", музычная камедыя "Брыялін".

1977 | 1995—2001 | 2000-я | 2009—2017 | 2018

Праходзіць падрыхтоўку на факультэце рэжысуры драмы Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Сярод настаўнікаў — Л. Манакова, А. Суцкавер, М. Кірычанка, А. Андросік, Б. Луцэнка. Стажыруецца, вывучаючы чорны тэатр і тэатр ценей у Германіі і камедыі дэль арэ ў Італіі. Удзельнічае ў майстар-класе народнага артыста Расіі, тэатральнага рэжысёра Л. Хейфеца, у арганізацыі і пастаноўцы традыцыйных балаў у Вене.

За дасягненні на рэжысёрскай ніве атрымлівае ганаровую грамату Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, граматы і падзякі Міністэрства культуры. З 2013-га кіруе аб'яднаннем "Талент". Стварае дзіцячыя спектаклі "Фрэйзен Бок вяртаецца", "Кот Матроскін", а таксама пастаноўкі для дарослых "Джэнтльмены", "Пагуляем у каханне".

Сцэна з пастаноўкі "Бурлеск"

Мюзікл-дэтэктыў "Джэк Патрашыцель"

Сцэна са спектакля "Гур'янаў"

Зараз Уладзіслава Арцюкоўская шчыруе над зўтарскай камедыяй "Асцярожна, кекс!" з удзелам зорак: Уладзіміра Варанкова і Аляксандры Гайдук. Спектакль сёлета з'явіцца на сцэне Маладзёжнага тэатра эстрады. Яшчэ рэжысёр рыхтуе пастаноўку пад працоўнай назвай "Пакуль дыхаю, спадзяюся" па матывах жыцця ваеннага контрразведчыка часоў Вялікай Айчыннай. Твор будзе прысвечаны тэме вернасці, сумленнасці і любові.

За выдатныя дасягненні ў прафесійнай дзейнасці і значны асабісты ўклад у развіццё тэатральнага мастацтва ўганаравана медалём Францыска Скарыны.

3 2018-га па 2021-ы працуе педагогам на кафедры рэжысуры БДУКМ. За напісанне і пастаноўку мюзікла-дэтэктыва "Джэк Патрашыцель" у намінацыі "Найлепшы музычны спектакль, мюзікл" атрымлівае Нацыянальную тэатральную прэмію, граматы і падзякі Міністэрства культуры.

2023 | 2022 | 2018—2021

Піша падручнік па рэжысуры. Арганізоўвае ўнікальнае мерапрыемства — баль БЕЛАЗа, прымеркаваны да 75-годдзя завода. Імпрэзу правядуць 16 верасня ў цэху, дзе выробляюцца самыя буйныя ў свеце самазвалы.

Маладзёжны тэатр эстрады пад кіраўніцтвам Уладзіславы Арцюкоўскай працягвае гастрольны тур са спектаклем "Гур'янаў". Сёлета ён ужо быў паказаны на сцэнах "Славянскага базару" ў Віцебску, Палацы Рэспублікі ў Мінску, у Магілёве. Пастаноўку яшчэ прапануюць гледачам у Жодзіне, Брэсце, Барысаве, а таксама ў Санкт-Пецярбургу і ў наступным годзе — у Маскве.

Стварае буйныя культурныя праекты. Напрыклад, выступае зўтарам і рэжысёрам "Венскіх балю" у Палацы Незалежнасці, якія ладзіліся з 2018 па 2022 год, галоўнага канцэрта "Александрын збірае сяброў" (2021—2023), а таксама спартыўна-культурнага фестывалю "Вытокі", які цяпер праходзіць у гарадах Беларусі.

Сёння Уладзіслава Арцюкоўская — адзін з найбольш заўважных тэатральных дзеячаў. Яна напісала звыш 100 твораў на рускай і беларускай мовах — п'есы, мюзіклы, апавяданні, песні. Таленавіты рэжысёр і драматург працягвае па-майстэрску ўвасабляць смелыя дзяржаўныя праекты і ставіць сучасныя, крэатыўныя спектаклі.

Анонс:
18 жніўня Маладзёжны тэатр эстрады выступіць з музычнай камедыяй "Брыялін" на фестывалі "Вытокі" ў Касцюковічах. Тэатральны сезон у Мінску для калектыву адкрыецца 14 верасня.

Адна з пляцовак фестывалю

# Дзве ракі — 14 рэгіёнаў

**У Докшыцах прайшоў Рэспубліканскі фестываль сяброўства і мастацтва "Дзве ракі". Святочныя мерапрыемствы, прымеркаваныя да Дня горада, наведала больш за 900 гасцей з Беларусі і Расіі.**

Форум "Дзве ракі" праводзіцца ўжо сёмы раз і звязвае 14 рэгіёнаў з пяці абласцей нашай краіны. Сёлета імпрэзы ладзілі з 11 па 13 жніўня.

— Практыка паказвае, што фестываль патрэбны як мясцовым жыхарам, так і гасцям, бо геаграфія пастаянна павялічваецца, — распавядае намеснік старшыні Докшыцкага райвыканкама Аксана Палачаніна. — Штогод цікавасць да свята расце, і мы разумеем, што трэба пашырацца. Выбіраем розныя напрамкі, каб кожны, нават вельмі пераборлівы, глядач мог для сябе знайсці нейкую разынчаку і адкрыць нешта новае.

Сустракалі гасцей галоўныя сімвалы фестывалю — Вілія і Бярэзіна. Іх водападзел размяжоўвае басейны Балтыйскага і Чорнага мораў. Сёлета беларускія рэкі ажывілі Ангеліна Карповіч і Анастасія Явід, удзельніцы конкурсу прыгажосці "Міс Докшыцы — 2023".

Першы дзень форуму — творчы. Адкрылі яго пленэр мастакоў "Палітра сяброўства", выставы расійскіх і беларускіх майстроў "Руская Атлантыда", якую падарыў жыхарам горада Клуб праваслаўных мецэнатаў, і "Вернісаж фестывальнай Докшыччыны", дзе былі прадстаўлены фатаграфіі яркіх момантаў форуму ў мінулыя гады. Здымкі па традыцыі ўпрыгожылі вокны раённай бібліятэкі. У гарадскім Цэнтры культуры размясцілася калекцыя сувеніраў ад гасцей і ўдзельнікаў свята, а таксама буклеты з турыстычнымі маршрутамі раёна.

На працягу ўсяго дня працаваў "Горад майстроў", дзе можна было набыць вырабы рамеснікаў і пазнаёміцца з культурнымі брэндамі Докшыччыны. Добрай традыцыяй стаў "Салодкі фальварак" з пачастункамі — творамі кулінарнага мастацтва. Сітуацыі сельсавет прэзентаваў свой брэнд — самаробныя сыры. Гаспадыні таксама прыгатавалі смачныя сырнікі, кабачкі з сырам і салодкую выпечку. Бярэзінскі сельсавет славіцца чарніцамі, якой багатыя лясы тутэйшага біясфернага запаведніка. Ёсць у жыхароў рэгіёна і іншыя традыцыі, напрыклад унікальны метад засолкі сала. А яшчэ ў краі робяць незвычайных творожных слімакоў і медавуху.

Не абышлося і без новаўвядзення. Ім стаў праект "Людзі міру і стварэння", які размясціўся ў зялёнай зоне паблізу адміністрацыі. Фотавыстава распавяла пра асоб, што дамагліся поспехаў як у прафесійнай, так і ў творчай, спартыўнай дзейнасці.

Сярод запамінальных падзей першага дня — і пеннае шоу, і раённы конкурс на найлепшае афармленне транспарту "Фестывальны аўтарэстайлінг", які праводзіцца ў рамках форуму ўжо другі раз. Прадстаўнікі мясцовых арганізацый падышлі да мерапрыемства крэатыўна і аздобілі тэхніку з гумарам. Госці фестывалю з задавальненнем фатаграфаваліся з "сакратаром" этраканторы ў савецкім стылі і на фоне святочнай аўталаўкі.

Насычанай была і спартыўная праграма. Другі дзень парадаваў гасцей раённымі турнірамі па міні-футболе, пляжным валейболе, лёгкаатлетычнай і сямейнай эстафетай. Завяршыліся спаборніцтвы розыгрышам Кубка дзвюх рэк па гіравым спорце. Адбыліся і творчыя імпрэзы: тэатралізаваны абрад-шэсце "Лебядзіная вернасць", раённая выстава-конкурс на найлепшую эмблему Года міру і стварэння, конкурс вакалістаў "Бярэзінскія напевы". Скончыўся фестываль канцэртам творчых калектываў і дыскатэкай пад адкрытым небам.

Падчас дэгустацыі

# Культурнае задавальненне

**Мінулыя выхадныя былі багатымі на святы. Адным з самых маштабных стаў XII Міжнародны фестываль фальклору "Мотальскія прысмакі". Сёлета ён сабраў 12 тысяч гасцей з розных куткоў свету.**

Форум традыцыйна праходзіць кожныя два гады. Да ўрачыстасці пачынаюць рыхтавацца практычна за восем месяцаў. Арганізацыя даволі складаная: на свята гастраноміі з усіх куткоў прыязджае вельмі шмат гасцей.

— За час існавання гэты кулінарны фэст набыў міжнародны статус і велізарную папулярнасць, — адзначае старшыня Іванаўскага райвыканкама Анатоль Ткачук. — У розныя гады ўдзельнікамі фэсту станавіліся госці з многіх краін. Сёлета Расія, Малдова, Арменія, Азербайджан, Туркменістан, Ізраіль і Карэя прадстаўлены дыяспарамі, якія пражываюць на тэрыторыі Беларусі. Яны з радасцю адгукнуліся, добра ведаюць наш фестываль, і ім прыемна паўдзельнічаць. Гэта яшчэ раз падкрэслівае наша братэрства, адзінства і адкрытасць.

Сёлета на "Мотальскія прысмакі" завітала 10 дыяспар. Па нацыянальных касцюмах можна было пазнаць іх чальцоў. Сваёй культурай яны дзяліліся не толькі ля сталоў, але і на сцэне, дзе пазнаёмілі гасцей з народнымі песнямі і танцамі. Асаблівым упрыгожаннем фэсту стала святочнае шэсце, на якім мясцовыя жыхары прадэманстравалі ўласную гасціннасць і шчодрасць, працавітасць і прадпрымальнасць ва ўсёй красе.

Пры ўваходзе на падзею гасцей сустракала "Мотальская мытня" — толькі пасля жартоўнага кантролю можна было патрапіць на галоўную фестывальную вуліцу. На падворках гаспадары і гаспадыні частавалі разнастайнымі кулінарнымі вынаходствамі. Па некалькі фірменных страў беларускай і замежных кухняў выстройваліся цэлыя чэргі. А для тых, хто стаміўся ад шуму і мітусні, быў адкрыты домік гарбаты з травянымі напоямі.

Культурная праграма таксама выдалася "смачнай". Прайшло некалькі канцэртаў, а на плошчы Боны Сфорцы разгарнуўся святочны баль. На другі дзень фестывалю гасцей запрашалі да стала сяброўства "Прысмакі гасцям з усіх рэгіёнаў!". Завяршылася ўрачыстасць яскравым гала-канцэртам.

# Дзень варэння

**Штогод у Чэрыкаўскім раёне ладзяць кірмаш "Дзень варэння". Сёлета фестываль праходзіць 18 жніўня.**

Арганізатары падрыхтавалі конкурс "Свята варэння", выставы-дэгустацыі фруктова-ягаднай прадукцыі і мёду, а таксама яркі канцэрт. Будуць працаваць разнастайныя тэматычныя пляцоўкі, сярод якіх выставы-продажы, майстар-класы па дэкаратыўна-прыкладной творчасці, літаратурныя чытанні, інтэрактыўная спартыўная пляцоўка і шмат іншага. Удзельнікі прадставяць сочыва, зваранае па сямейных рэцэптах, што перадаюцца з пакалення ў пакаленне. На кірмашы прапануюць салодкі ласунак як з традыцыйных інгрэдыентаў, так і з іншых нечаканых складнікаў. Іскрынкай свята стане прыгатаванне "Варэння сяброўства" разам з гасцямі. Размесціцца фестываль на пляцоўцы ля раённага Дома культуры.

# Дрыбін запрашае!

**XII Рэгіянальны фестываль народнай творчасці, промыслаў і рамёстваў "Дрыбінскія таржкі" адбудзецца 18–19 жніўня. Традыцыйна ў свяце паўдзельнічаюць майстры і калектывы не толькі з усёй Беларусі, але і з блізкага замежжа.**

Першы дзень свята прысвечаны моладзі. На возеры Кропелька і цэнтральнай плошчы Дрыбіна гасцей чакаюць інтэрактыўныя і гульнявыя пляцоўкі для дзяцей усіх узростаў, конкурс малюнка на асфальце, фестываль фарбаў, а таксама творчыя нумары. Вячэрні блок адкрые канцэрт "Будучыня — гэта мы". Завершыць першы дзень святочная дыскатэка.

Галоўныя мерапрыемствы прыпадуць на 19 жніўня. Рамеснікі прадэманструюць прадукцыю ў "Горадзе майстроў", на цэнтральнай плошчы разгорнуцца народныя забавы. На кожным падворку акрамя страў усе ахвотнікі змогуць пакаштаваць гарбату па-дрыбінску. Закончыцца фестываль канцэртам, маляўнічым фаер-шоу і салютам.

**Матэрыялы рубрыкі падрыхтавала Яўгенія ГАБЕЦ**

Сеньёр Памідор і Памідорка

# Што такое "Іўе-дэ-Таматэйра"?

## "Чэры-2023": памідорны рай, батлы на любы густ і новыя падыходы да арганізацыі свят

**Выправіцца ў Іўе была нагода: 12 жніўня там адзначалі Дзень горада. Зацікавіў нас і брэндавы фестываль — "Іўеўскі памідор". Як прайшло мерапрыемства і чым здзіўлялі гасцей? Уражаннямі, як і таматаў, — вельмі шмат.**

### ДЗЕНЬ ГОРАДА ВА ЎСЁЙ КРАСЕ

Урачыстае святкаванне Дня горада, — а сёлета споўнілася 629 гадоў з першага ўпамінання Іўя ў гістарычных дакументах, — было зладжана ў самым цэнтры, каля манумента "У гонар сяброўства і адзінства канфесій Іўеўшчыны". Тут сабраліся шматлікія жыхары, госці, прадстаўнікі раённых і абласных улад, якіх вітала княжна Ева, уласніца тутэйшых зямель, Сымон Будны, Барбара Радзівіл ды іншыя гістарычныя знакамітасці Беларусі. Зразумела, што ў ролі славутых асоб выступалі мясцовыя супрацоўнікі сферы культуры ў строях.

З віншавальным словам да прысутных звярнуліся старшыня Іўеўскага райвыканкама Ігар Генец і старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Алена Пасюта, якая ўручыла ордэны Маці шматдзетным маці Іўеўшчыны. А Ігар Генец і старшыня Іўеўскага раённага Савета дэпутатаў Аляксандр Хвасько перадалі пасведчанні аб прысваенні званняў "Ганаровы жыхар Іўеўскага раёна" муфтыю Мусульманскага рэлігійнага аб'яднання Рэспублікі Беларусь Абу-Бекіру Шабановічу і сучаснаму айчыннаму паэту, празаіку, грамадскаму дзеячу Івану Карэндзю.

Пасля ўрачыстасці ўсе яе ўдзельнікі шэсцем, якое ўзначальвалі Сеньёр Памідор і Памідорка, адправіліся да набярэжнай гарадскога возера. Там разгарнулася асноўная частка "таматнага" фестывалю.

### СЯМЕЙНАЕ СВЯТА

— Мы даўно паставілі задачу сумесна з раёнамі адшукаць у кожным з іх брэндавую падзею, — адзначыла начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама Алена Клімовіч. — Усе раёны пачалі думаць, раіцца. У Іўі прапанавалі ладзіць "Іўеўскі памідор", бо тут шмат людзей займаецца агароднiцтвам, тут ёсць уласная культура вырошчвання таматаў, ёсць пэўная мясцовая традыцыя. Гэта, я б сказала, нават своеасаблівы лад жыцця, бо гадаванне памідораў, як вядома, пачынаецца з зімы, калі высаджваецца расада, і цягнецца аж да восені. Гэта тое, чым людзі жывуць.

Па словах Алены Клімовіч, фестываль "Іўеўскі памідор", уключаны, дарэчы, у план абласных культурна-масавых мерапрыемстваў, адрозніваецца ад іншых свят на Гродзеншчыне тым, што ў ім прымаюць самы чынны ўдзел не толькі работнікі культуры, але і літаральна ўсе жыхары Іўя, таму тут панае сямейная, сяброўская атмасфера, а сама імпрэза, як жывы арганізм, развіваецца па ўласных законах ды год ад году пашыраецца і становіцца ўсё больш вядомай у Беларусі і за яе межамі.

Шматлікія конкурсы, напрыклад "Таматная сямейка", дзіцячае шоу "Тамаці-паці", пенная дзіцячая вечарынка ды іншыя забавы, толькі пацвярджалі словы Алены Клімовіч пра сямейную скіраванасць фэсту. А яшчэ тут можна было пагуляць у памідорны дартс, паўдзельнічаць у конкурсе на найлепшы тэматычны карнавальны касцюм "Чэры-2023", пакаштаваць на палявой кухні леча "Зроблена ў Іўі" ды паласавацца памідорным цуда-бутэрбродам. Яго памер, як адзначыла кампетэнтнае журы, — 7 метраў 81 сантыметр.

Гэтую дзіўную страву, якой змог падсілкавацца ледзь не кожны з прысутных, з самага рання рабілі бібліятэкары Іўеўшчыны. А калісьці ўсё пачыналася з трохметровага бутэрброда. У наступным годзе плануюць узяць рубеж у восем метраў. Чым не рэкорд, варты знакамітай Кнігі Гінеса?

### ПАМІДОРНЫ БАТЛ

Хапала на свяце і забаў, прызначаных для дарослых. Напрыклад, непадробную цікавасць выклікаў конкурс па перацягванні каната сярод шматлікіх камандаў, якія прадстаўлялі розныя прадпрыемствы горада. У спаборніцтве паўдзельнічаў і старшыня Іўеўскага райвыканкама Ігар Генец, які змяніў афіцыйны касцюм на спартыўную майку пад пачэсным першым нумарам і ўзначаліў сваю каманду. Дарэчы, мне даводзілася прысутнічаць на многіх фестывалях, але такі непасрэдны ўдзел у свяце кіраўніка раёна, скажу шчыра, я ўбачыў упершыню. Ці ж гэта не адзін з паказчыкаў — і даволі красамоўных! — таго, што ўвага мясцовай улады да імпрэзы самая пільная?.. І хоць перамогу ў спаборніцтве ўзялі асілкі з аддзела Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі, што заканамерна, добры настрой захапіў і канкурсантаў, і заўзятараў.

Але, натуральна, усе чакалі галоўнай дзеі — бітвы памідорамі. Яшчэ зімой, калі я ўпершыню наведаў Іўе з камандзіроўкай, Ігар Генец параіў, калі паеду на свята, захапіць зменнае адзенне. Таму я з дома ўзяў цёмную майку і нават байку. Забягаючы наперад, скажу, што гэтыя рэчы, на шчасце, не спатрэбіліся.

1. Старшыня Іўеўскага райвыканкама Ігар Генец прыняў удзел у перацягванні каната
2. Падчас урачыстага шэсця
3. Амаль васьміметровы іўеўскі бутэрброд

На рынку, агароджаным сеткай, сыходзіліся, станавіліся насупраць шматлікія каманды — і пачыналі кідацца таматамі ў сапернікаў. Гледачы ж актыўна падтрымлівалі знаёмых. Гэта было даволі ўражальнае відовішча, якое варта пабачыць на свае вочы. Магу без перабольшання сказаць, што бітва памідорамі "Іўе-дэ-Таматэйра" — сапраўдная фішка "Іўеўскага памідора", якая запомніцца надоўга, асабліва — удзельнікам батлаў.

Пазней уручалі прызы пераможцам і падводзілі вынікі конкурсу прыгажосці "Чырвоная каралева". Святочны дзень завяршылі дыскатэка, фаер-шоу, забаўляльная праграма з элементамі неонавага прадстаўлення і рэтравечарына "Усё будзе добра". Карацей кажучы, набіраюцца ўражанняў ад "памідорнага" фэсту можна было аж да позняй ночы.

### ПАСЛЯ ПАДЗЕІ — НОВЫЯ ІДЭІ

— Старшыня Іўеўскага райвыканкама Ігар Генец заўсёды падтрымлівае ўсе нашы ідэі і задумы, уносіць прапановы і, як бачыце, сам актыўна ўдзельнічае ў некаторых конкурсах, таму мы заўжды адчуваем дапамогу раённых улад, — заўважыла напрыканцы свята начальнік сектара культуры Іўеўскага райвыканкама Святлана Кішкель. — Акрамя таго, мы актыўна працуем над прыцягненнем пазабюджэтных сродкаў, таму і на сёлетнім "Іўеўскім памідоры" многія прызы забяспечылі менавіта спонсары, якіх мы, у сваю чаргу, актыўна рэкламуем. Так што супрацоўнічаем з узаемнай карысцю.

Што да арганізацыі фэсту, дык, па словах Святланы Кішкель, кожны раз, рыхтуючы "Іўеўскі памідор", каб здзівіць і парадаваць гараджан і гасцей, у сцэнарый мерапрыемства арганізатары дадаюць свежыя элементы. Таму яно штогод абнаўляецца і радуе ўдзельнікаў. Гэта значыць, наступнае свята будзе цікавейшым — турысты і мясцовыя жыхары атрымаюць ад "Іўеўскага памідора" яшчэ больш станоўчых эмоцый.

**Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ**

# Маргарыта, майстар, Воланд, баль

**Заканчэнне сезона ТЮГ адзначыў прэм'ерай. Гэта сумесная з тэатрам "ТрыТфармАТ" праца — "Майстар і Маргарыта".**

Праўда, спектакль так і хочацца перайменаваць, пакінуўшы проста "Маргарыта". Бо ў галоўнай ролі выступіла заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Вера Палякова-Макей — творца і адначасова дырэктар ТЮГа. Гасцямі ж на балі ў Воланда сталі гледачы партэра, куды спусціліся артысты. І па завяршэнні гэтай сцэны я з палёгкай уздыхнула, што да мяне не дабраліся: так сабе адчуванне — раптоўна аказацца патэнцыйным забойцам ці яшчэ кім-небудзь са злачынцаў-прывідаў. Бо гэта было без аніякага намёку на гульню ці пародыю — усё выключна ўсур'ёз.

Атмасфера абумоўлівалася яшчэ і тым, што ў спектаклі цалкам адсутнічала першая палова рамана — з д'ябальскімі забавамі Воланда, сатырычнымі тыпажамі і крытыкай савецкага жыцця-быцця. Пастаноўка пачыналася адразу з майстра — і з яго сустрэчы з Маргарытай.

Падобны падыход не навіна. Шматслойны раман М. Булгакава насычаны паралельным дзеяннем і разгалінаванымі сюжэтнымі лініямі — аха піць адразу ўсё, нічога не згубіўшы, немагчыма. Хаця такія спробы і былі. У 1992-м у нашым Вялікім тэатры з'явілася опера беларускага кампазітара Яўгена Глебава, у якой кожны з трох актаў закранаў нейкую адну сферу — і, адпаведна, схіляўся да аднаго з памежных жанраў. У цэнтры першай дзеі, блізкай да мюзікла, было скандальнае выступленне каманды Воланда ў тэатры Вар'етэ. Другая малявала баль (у рэжысуры Вячаслава Цюпы — з манекенамі). Нарэшце, трэцяя дзея перадавала раман майстра, і аповед пра Ешуа ўтрымліваў некаторыя рысы духоўных араторый. Сцэнаграфія Уладзіміра Арэф'ева ўяўляла сабой вялізны люстэркавы куб, у якім адбіваліся героі. Некаторыя з іх, дарэчы, мелі яшчэ і двайнікоў.

У цяперашняй інсцэніроўцы і пастаноўцы "Майстра і Маргарыты" ад маладога рэжысёра Таццяны Самбук усё спрошчана і максімальна скарочана. Дзеянне сканцэнтравана вакол тэмы кахання і ахвярнасці. Прадстаўнікі "цемры" ў пэўны момант пачынаюць нагадваць адну з праславутых "троек" (Гелы ў спектаклі няма!) часоў НКУС. У выніку атрымліваецца меладрама пазачасавага кшталту, але з некаторым гістарычным адценнем. Найбольш важныя, на думку рэжысёра, моманты паўтараюцца. Тая ж лёсавызначальная сустрэча цэнтральных герояў, у час якой між імі ўспыхвае каханне, ледзь не ператвараецца ў своеасаблівы "дзень сурка": вялізны ахапак кветак усё падае долу, а майстар паднімае іх — зноў ды зноў.

Характары персанажаў пераасэнсаваны. Майстар — жудасна нервовы, неўраўнаважаны, імпульсіўны, раз-пораз ён перажывае прыступы агрэсіі (я бачыла ў гэтай ролі Сяргея Лапаніцына, але, магчыма, Генадзь Гаранскі, задзейнічаны ў іншым складзе, увасабляе героя інакш). Маргарыта — наадварот, амаль увесь час упэўнена ў сваіх дзеяннях. На ролю Воланда быў запрошаны Антон Жукаў з Тэатра-студыі кінаакцёра. Але тут артыст не вострахарактарны, як звычайна, а максімальна стрыманы, нават дзесьці затарможаны. І больш падобны не да прызнанага ўладара цемры, а да гэткага шэрага кардынала — амаль непрыметнага, ды вельмі ўплывовага.

Спектакль цікавы сцэнаграфіяй Дар'і Волкавай. Паваротная сцэна дазваляе хутка змяняць белае шпітальнае атачэнне на чорнае (у тым ліку і спісанае крэйдай у фінале), а таксама на згаданую ў рамане "нядобрую кватэру" з трывожнымі чырвонымі шпалерамі, афармленую сапраўды выдатна. Раз-пораз узнікаюць і відэавыявы. Насамрэч фантастычным становішча палёт Маргарыты, перададзены вельмі простымі сродкамі — з дапамогай вентылятара, што развявае белы плашч, надзеты зверху чорнага трыко, і адпаведнага асвятлення. Строі мастачкі Наталлі Лазарчык дастаткова простыя, яны не прыцягваюць залішняй увагі, але надзяляюцца пэўным сэнсам. Кот Бегемот (Андрэй Дабравольскі з РТБД) носіць вялізную каціную маску. Кароўеў (Андрэй Асімовіч з Музычнага тэатра) апрануты ў цяльняшку, чорны плашч і чорныя акуляры. Карона Маргарыты аказваецца чорным німбам. Як заўжды, кампазітар Дар'я Гарбузняк (Масква) дапоўніла дзеянне песнямі ў жывым выкананні.

Жанрава спектакль азначаны "фантастычная казка для дарослых". Невыпадкова ў ім падкрэслена вядомая булгакаўская фраза Маргарыты: "Я табе казку раскажу". Пры ўсім разуменні пазіцыі пастаноўшчыкаў (маўляў, фантастыкі тут хапае, а ўпамінанне казкі настройвае на пазітыўны фінал), з жанравай фармулёўкай так і хочацца паспрачацца. Бо выраз "казка для дарослых" сведчыць пра немагчымасць увасаблення дзеі ў рэальнасці. І калі галоўнай тэмай абрана менавіта каханне, дык лагічна прапанаваць здагадку, што такое моцнае пачуццё ў жыцці не сустракаецца. Спектакль жа сцвярджае адваротнае! Ён заканчваецца вельмі сімвалічнай сцэнай: закаханыя павольна сыходзяць у вялізныя відэапартрэты, быццам знікаюць, распускаюцца адзін у адным.

Сцэны са спектакля "Майстар і Маргарыта"



# Містычна і крыху нервова

**"Фаўст" І. Гётэ — класіка, што будзе чытацца і перачытвацца вечна. Гэтым разам паэму ўвасобілі ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя М. Горкага — пад назвай "Фаўст. Здзелка з д'яблам".**

Героі спектакля "Фаўст"

Рэжысёрам выступіў малады Дэвід Разумаў. У адпаведнасці са сваім позвішчам ён надаў увагу не толькі пачуццёваму пачатку, звязанаму з меладраматычнай гісторыяй Маргарыты, але і найперш рацыянальнаму — той філасофскай лініі, што была для Гётэ галоўнай.

Сапраўды, гэты паэтычны твор зацікавіў дзеячаў тэатра, ледзь з'явіўшыся. Асабліва актыўнымі былі кампазітары. Але ўсім, хто хацеў напісаць оперу, аўтар адмаўляў, у тым ліку Бетховену, сцвярджаючы, што хіба Моцарт здолеў бы пакласці паэму на музыку. Гётэ не адхіліў толькі прапанову аднаго з прадстаўнікоў роду Радзівілаў — Антонія Генрыха, які на той час быў знаным палітычным дзеячам і жыў у Прусіі, бо ажаніўся з мясцовай прынцэсай. Гётэ сам выступіў лібрэтыстам. Атрымалася насамрэч не опера, а меладрама ў першасным значэнні гэтага слова — музычна-тэатральны твор XVIII стагоддзя, у якім акрамя оперных спеваў ёсць размоўныя дыялогі ў аркестравым суправаджэнні, што надае ім большую эмацыйнасць. Такое сэнсавае акцэнтаванне сказанага, а не толькі праспяванага слова дазволіла захаваць важныя для Гётэ філасофскія моманты.

Жанр цяперашняга спектакля азначаны як "містычная гісторыя". У ім скарыстаны вершаваны тэкст і пераклады не толькі М. Халадкоўскага, Б. Пастэрнака, К. Іванова, але і самога Д. Разумава. Дарэчы, у яго першай рэжысёрскай працы яшчэ шырэй рэалізаваліся разнастайныя творчыя памкненні: дагэтуль Дэвід увасобіў на камернай сцэне Горкаўскага свой монаспектакль, у прасторы якога быў таксама мастаком-пастаноўшчыкам і акцёрам.

Прэм'ерны "Фаўст..." — дэбютная работа Разумава на вялікай сцэне. Насычаная і вельмі ўдалая. Спляценне псіхалагізму і філасофскіх разваг пра сутнасць жыцця на зямлі (прычым у асобасным і адначасова сусветным маштабах) набывае атмасфернасць, асаблівую гукавую аўру і прыцягальную відовішчнасць — з фантазійнымі строямі персанажаў. Пры гэтым у спектаклі няма ні груваткай сцэнаграфіі (мастак — Таццяна Стысіна), ні нейкіх галівудскіх спецэфектаў. Пастаноўка вырашаецца з дапамогай тэатральнага святла, якое робіць сапраўдныя цуды, "дымавых завес" і паваротнай сцэны ў якасці не столькі тэхнічнага сродку для змены карцінкі, колькі шматзначнага сімвала хуткаплыннасці часу.

Размеркаванне роляў — папраўдзе выдатнае. Экзальтаваному Фаўсту (Аляксандр Палазкоў) супрацьстаіць халодны, разважлівы Мефістофель з яго багаццем тэмбравых, інтанацыйна-рытмічных варыяцый голасу (Сяргей Чэкерэс). Голас Бога належыць дзіцяці, што агучвае, не з'яўляючыся на сцэне, Ясенія Жбанкова — дзяўчынка з цалкам тэатральнай сям'і. Узаемаадносіны маладога Фаўста (Кірыл Нікіцін) і Маргарыты (Віталіна Бідзюк — ёй адначасова належыць вельмі добрая, асабліва ў сцэнах са злымі духамі і світай Мефістофеля, харэаграфія спектакля) напоўнены шчырасцю юнацтва. У постаці Валянціна (Аляксей Качан) падкрэслена ўся супярэчлівасць яго характару. Дарэчы, гэты персанаж забіты ў спектаклі не Фаўстам з дапамогай д'ябальскай сілы, а самім Мефістофелем, што прыўзнімае фігуру галоўнага героя.

Музыка Андрэя Папкова становіцца яшчэ адной удалай фарбай тэмбрава багатай фанасферы спектакля: неабходнае ўражанне робяць і адзіночныя працяглыя гукі, і спевы а капэла, і фінальная гімнічнасць — з ёй звязаны момант, калі Маргарыта адводзіць Фаўста ў вечнасць, сыходзячы праз усю залу. А Мефістофель нарэшце страчвае знешнюю абыякавасць — няўжо гэта крык прачулай душы? Вырашаць гледачам: ім ёсць пра што задумацца і падчас, і пасля спектакля.

# "Соня" заснуць не дасць

Сцэна са спектакля "Соня"

**Адзначаючы 135-годдзе, Магілёўскі драматычны тэатр у канцы сезона аднавіў вельмі прыгожа афармленую камедыю "Рамантыкі" — з шыкоўнымі льнянымі строямі. А ўвесну рэпертуар калектыву папоўніўся незвычайным спектаклем "Соня".**

"Соня" пастаўлена па невялічкім апавяданні Таццяны Талстой. Усяго некалькі старонак тэксту ператвараюцца ў паўнавартасны спектакль, вырашаны менавіта тэатральнай мовай — з дапамогай не толькі ўласна слова, але і пластыкі, жывой музыкі, сцэнаграфіі, выбітнай акцёрскай игры і дадатковых светлавых эфектаў на мяжы рэальнасці і метасвету, прычым без аніякага ўмяшання патаемных сіл. Гэтая папраўдзе аўтарская пастаноўка і на сёння, на маю думку, найлепшая творчая праца Міхаіла Лашыцкага, які выступае і рэжысёрам, і мастаком. Ніякай звыклай інсцэніроўкі, пабудаванай на дыялогах, — захавана інтанацыя пісьменніцы, расквечаная тэмбравай разнастайнасцю жаночых галасоў ад кантральта з працяглымі сексуальнымі ноткамі да парадыйна-дзіцячай скорагаворкі.

Соню іграе... Аляксей Цыбін. Прычым без камедыйных адценняў, што звычайна ўзнікаюць пры мужчынскім увасабленні жаночых роляў. Калі не ведаеш гэтага таленавітага артыста, ніколі не паверыш, што гэта не сапраўдная жанчына: пластыка, хада, пагляд, сама постаць — акурат Соніны! А вось голас — пазычаны ў Марыі Рудаковай (яна, дарэчы, напярэдадні выратавала прэм'еру "Лесу" М. Астроўскага, літаральна за дзень вывучыўшы цэнтральную ролю і замяніўшы калегу, што атрымала складаны пералом). Здагадацца пра "агучку" немагчыма, настолькі супадаюць мімка і маўленне — лепш, чым у кіно, у якім голас запісваецца пазней.

Пайменна трэба назваць і астатніх артыстаў, што разам з Марыяй утвараюць не толькі акцёрскі, але і музычны ансамбль, засвоіўшы гітару, дудку, баян, фартэпіяна. Гэта Настасся Барукова, Крысціна Грынаўцава і Настасся Чычына. Музычнае афармленне Аляксандра Чачушкіна нараджае зменлівую атмасферу, што літаральна дыхае разнастайнасцю тонкіх адценняў. Гучанне дудкі таксама нагадвае дыханне ветру. Рэзкія акорды на гітары адлюстроўваюць псіхалагічны абрыў. Фартэпіяна, як высвятляецца, можа стаць ударным інструментам — асабліва калі пагрукаць па яго пюпітры. А піяністка, пасаджаная ў інваліднае крэсла, раптам аказваецца паралізаванай старой Адай Адольфаўнай — антаганістам галоўнай гераіні.

Сцэна са спектакля "Рамантыкі"

Спектакль акрэслены як "прыпавесць пра каханне" і мае ўзроставае абмежаванне 16+. Але ж насамрэч змест пастаноўкі шырэйшы: яна здольная стаць добрым выхаваўчым сродкам пры сямейным праглядзе з падлеткамі. Бо пры ўсёй сцісласці выкладання і сканцэнтраванасці на цэнтральнай гераіні, яе атачэнні ў прыпавесці ёсць самыя розныя адгалінаванні. Так, для пакалення старэньких бабуль-дзядуль будзе прыемным паглыбленне ў пасляваенныя часы маладосці (на тым паказе, што я наведала, у зале была цэлая дэлегацыя Гарадскога савета ветэранаў, прадстаўнікі якой нават выйшлі на сцэну са шчырымі віншаваннямі). Падлеткі змогуць без цяжкасці спрацыраваць падзеі на сучаснае школьнае жыццё і распазнаць у іх булінг — цкаванне з боку аднагодкаў. Інтэлектуалы заўважаць тэму маленькага чалавека ў жорнах гістарычных працэсаў. І абсалютна ўсе прыкмецяць падкрэсленую тэму кахання і, шырэй, любові.

Закладзеныя ў спектакль візуальныя лейтматывы ніколі не зашыфраваны, вылучаны сімволікай. Яны таксама зразумелыя самай шырокай публіцы. Фінальная ж вызва белага голуба на чорным фоне не пакідае нікога раўнадушным і становіцца ўвасабленнем глыбокай Сонінай душы, поўнай усёабдымнай дабрыні і іншых найлепшых чалавечых якасцей.

Найбліжэйшы паказ "Соні" — толькі 17 верасня. А 15-га, акурат за два дні да таго, Магілёўскі драматычны тэатр адкрые новы сезон чарговай прэм'ерай — гэта "Хітрыкі Скапэна" па Мальеру ад рэжысёра Камілі Хусаінавай.

**Матэрыялы рубрыкі падрыхтавала Надзея БУНЦЭВІЧ**
Фота Уладзіміра ШЛАПАКА, Ганны ШАРКО

# Калі праца — у радасць

Наталля Ярмоцык

**“Вельмі прыгожая душою і сціплая творчая асоба”. Так кажуць землякі пра Наталлю Леанідаўну Ярмоцык. Заснавальніца абяднання рамеснікаў Бярозаўшчыны нядаўна адсвяткавала 60-годдзе, што стала добрай нагодай распавесці пра мастацтва і жыццёвы шлях майстрыхі.**

...Выпускніца Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Наталля Ярмоцык была ўпэўнена, што педагагічна-выхаваўчая дзейнасць — гэта і ёсць яе прызначэнне, пакуль выпадкова не ўбачыла майстрыху, якая пляла штосьці з саломы. Лёгкая на пад'ём, дзяўчына ўладкавалася на Брэсцкую сувенірную фабрыку, каб авалодаць новым захапленнем. Тут і адкрыла для сябе сапраўдную Атлантыду з яе незлічонымі скарбамі і невычарпальнай крыніцай творчасці.

Як паказаў час, цікавасць да саломапляцення ў жыцці Наталлі Ярмоцык — з'ява невыпадковая. Майстрыха ўнесла вялізны ўклад у захаванне і развіццё гэтага віду дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва — адрадзіла ў рэгіёне амаль страчаны старадаўні звычай спіральнага пляцення і дала яму другое жыццё. Яе вырабы, створаныя ў спрадвечнай манеры, маюць сучасны выгляд. Гэта прыгожыя ўтылітарныя прадметы, да таго ж зручныя, лёгкія. У калекцыі работ таленавітай мастачкі як традыцыйныя рэчы, так і аўтарскія знаходкі.

Адраджэнне спіральнага пляцення, высокі ўзровень выканання і намаганні рукадзельніцы па распаўсюджванні старажытнага рамяства былі адзначаны на высокім узроўні. У 2016 годзе Наталлі Ярмоцык прысвоена ганаровае званне “Народны майстар Беларусі”.

Сёння яе імя — брэнд не толькі на Бярозаўшчыне, але і ў вобласці. Яно добра вядомае сярод майстроў Беларусі. Рамесніца вельмі шануе свой аўтарытэт: выкананая ёй рэч павінна быць толькі высакаякаснай. Для Наталлі Леанідаўны проста што-небудзь рабіць — недастаткова, яна хоча тварыць. У выніку кожны прадмет — арыгінальная аўтарская праца, якая адлюстроўвае любоў, старанне, імкненне да прыгажосці.

Прафесійная слава бяжыць наперадзе бярозаўскай майстрыхі. Завушніцы, пацеркі, капелюшы, какошнікі — саламяныя атрыбуты, зробленыя Наталляй Леанідаўнай, упрыгожваюць сцэнічныя касцюмы многіх фальклорных калектываў Брэстчыны і не толькі. Яе капелюшы набыў Імперскі рускі балет пад кіраўніцтвам заслужанага дзеяча культуры Расіі Гедыміната Таранды. Зусім нядаўна вядомы мінскі брэнд адзення прапанаваў Наталлі Ярмоцык стварыць саламяныя аксесуары для калекцыі жаночых уборaў. І гэта далёка не поўны пералік сведчанняў прафесійнага прызнання рукадзельніцы. Яе аўтарскія вырабы раз'ехаліся амаль па ўсім свеце.

Практычна ніводная выстава або фестываль народнага мастацтва не абыходзяцца без удзелу Наталлі Ярмоцык. Яна неаднаразовы пераможца і дыпламант Рэспубліканскага святакірмашу народных рамёстваў “Вясновы букет”.

Дзякуючы такім апантаным і неабыякавым да народнай спадчыны руплівцам, саломапляценне зрабілася сапраўдным мастацтвам. Наталля Ярмоцык упэўнена, што ўключэнне беларускага саломапляцення ў Спіс сусветнай нематэрыяльнай культурнай спадчыны паспрыяе пашырэнню гэтага рамяства, што любімая справа майстрыхі будзе працягвацца і квітнець.

Таму яшчэ адзін складнік жыцця Наталлі Леанідаўны — узорная студыя саломапляцення “Цудадзейная саломка”, якой рамесніца аддае вялікую частку душы. Тут адмысловец вучыць дзяцей і падлеткаў сакрэтам майстэрства, развівае іх здаткі і густ, перадае любоў і павагу да беларускага народнага мастацтва. Выхаванцы старанна і карпатліва ствараюць маленькія саламяныя дзівосы і з задавальненнем удзельнічаюць у разнастайных конкурсах.

“Я чалавек, які любіць атрымліваць ад работы радасць”, — гаворыць пра сябе Наталля Леанідаўна, якая да таго ж шмат гадоў працавала кіраўніком Дзіцяча-юнацкага спартыўна-эстэтычнага цэнтра. Падобную радасць адчувае і той, хто ў жыцці сутыкаецца з гэтай таленавітай жанчынай.

Адзін са складнікаў жыцця Наталлі Леанідаўны — узорная студыя саломапляцення “Цудадзейная саломка”, якой рамесніца аддае вялікую частку душы.

**Зоя ГУКІНА,**
кіраўнік народнага раённага клуба майстроў народнай творчасці "Суквецце" Дзіцяча-юнацкага спартыўна-эстэтычнага цэнтра Брэзы

## З любоўю да роднага

**Як папулярызаваць рэгіянальную спадчыну, добра ведае Валянціна Аляксандраўна Марчанка. А яшчэ метадыст па традыцыйнай культуры Краснапольскага РЦК актыўна вывучае звычаі свайго краю і займаецца даследчай дзейнасцю. Пра плён працы і прафесійную пазіцыю адмыслоўца — з ліста ў рэдакцыю.**

— Фальклорных запісаў Валянціны Аляксандраўны — ужо не адна кніга, — распавядае вядучы рэдактар Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветнай работы Крысціна Башарымава. — Метадыст імкнецца рознымі шляхамі і сродкамі распаўсюджваць калекцыю даследаванняў — праз выданне брашур і буклетаў, артыкулы ў СМІ, семінары з калегамі, праз краязнаўчыя семінары.

Дарэчы, рэгіянальныя краязнаўчыя чытанні “Мой край: вядомы, невядомы” В. А. Марчанка ладзіць на Краснапольшчыне ўжо чатыры гады.

Таксама знаўца з поспехам удзельнічае ў конкурсах па тэматыцы года, якія абвяшчае Нацыянальная бібліятэка Беларусі. У намінацыю “Песні нашай Радзімы” Валянціна Аляксандраўна дасылае запісы з багатай скарбніцы самабытных спеваў народнага фальклорнага ансамбля “Горскія харашухі”, кіраўніком якога з'яўляецца, а ў намінацыю “Культура і побыт беларускага народа” — свае творы на аснове даследчых матэрыялаў і фальклорных занатовак.

А не так даўно руплівец атрымала зборнік навуковых прац “Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні”, што выпускае НАН Беларусі. У кнізе ў раздзеле “З калекцыі фальклорных запісаў” надрукавана работа В. А. Марчанка. Па ацэнцы галоўнага рэдактара выдання, доктара філалагічных навук Т. В. Валодзінай, матэрыял нашай гераіні цікавы этнаграфічнай дакладнасцю, новымі адметнымі дэталямі, эмацыянальна яркі і кранальны. А як інакш, калі размова ідзе пра родную культуру?

Кадры з фільма "На іншым беразе"

# Што чакае на іншым беразе?

**Месяц застаўся да рэспубліканскай прэм'еры нацыянальнага праекта студыі "Беларусьфільм" — "На іншым беразе". Карціну рэжысёра Андрэя Хрулёва, знятую ў традыцыях айчыннага кіно, прэзентуюць гледачам 17 верасня — у Дзень народнага адзінства.**

Падзеі стужкі разгортваюцца ў 1925 годзе. Гэта час, калі пасля Рыжскай мірнай дамовы заходняя частка Беларусі апынулася пад уладай палякаў, якія імкнуліся правесці хуткую асіміляцыю — выкараніць на захопленых тэрыторыях беларускую культуру, мову, праваслаўную веру. Фільм распавядае, як важна берагчы родных, што значыць для чалавека Радзіма і як зрабіць няпросты выбар. Галоўныя героі праходзяць праз усё, што зразумела кожнаму з нас: спазнаюць боль ад страты блізкіх, умацоўваюцца ў веры ў справядлівасць, калі страчана надзея, і нанова здабываюць сэнс жыцця ў каханні. У цэнтры гісторыі — два браты, хлопцы з глыбінкі, якія абралі розныя шляхі і якіх аб'ядноўвае любоў да роднага краю.

Асновай сюжэта паслужыў партызанскі рух на той частцы Беларусі, што апынулася пад кіраўніцтвам Польшчы. Ключавы эпізод, які стане сюжэтным паваротам, — пакаранне двайнога агента рукамі яго сяброў-патрыётаў, што даведаліся пра здраду. Аднак дырэктар здымачнай групы Ірына Філіпава робіць акцэнт, каб пазбегнуць плётак пра “дакументальную” частку фільма, што сапраўдных гістарычных фігур у карціне не будзе, усе вобразы — выключна мастацкія:

— У стужцы адсутнічаюць прамыя гістарычныя паралелі. У ёй няма звароту да рэальных постацей Прытыцкага і Харужай, Танка, Лынькова. Магчыма, хтосьці з гэтых герояў зможа з'явіцца ў наступных частках. Зразумела, пры ўмове, што ў фільма будзе працяг.

Аўтары праекта — расійскі рэжысёр-пастаноўшчык Андрэй Хрулёў і беларускі сцэнарыст Іван Крываручка — абяцаюць дынамічную кінастужку пра тое, што сапраўды важна.

— Для мяне гэта перш за ўсё гісторыя простых людзей, — кажа рэжысёр. — Аповед пра тое, як яны ў складаных умовах — хтосьці мог, хтосьці не — знаходзілі сілы захаваць годнасць.

Рэжысёр упэўнены, зацікавіць фільм не толькі айчыннага гледача:

— Лічыць гэтую гісторыю чыста беларускай я б не стаў. Вядома, беларусы яе лепш зразумеюць, але і за межамі краіны стужку будуць глядзець.

### ПЛЫНЬ СЭНСУ

Першапачаткова праект заяўляўся пад назвай “Мы адзінныя”. Яна, па словах Ірыны Філіпавай, дала своеасаблівы штуршок развіццю сюжэтнай лініі, вызначыла ідэалагічны і мастацкі кірунак карціны. Аднак пасля працяглых правак у мантажы, падчас якога ад некаторых сцэн давялося адмовіцца, акцэнты змяніліся, і было прынята рашэнне даць іншую назву.

— Перадусім мы хацелі паказаць, што наша краіна моцная сваімі сямейнымі традыцыямі, агульнай тэрыторыяй, людзьмі, — падкрэсліла дырэктар здымачнай групы. — Мы пастараліся нагадаць пра той няпросты перыяд, калі Беларусь у чарговы раз спрабавалі разарваць на каваўкі. Фільм распавядзе пра ўзаемаадносіны людзей, якія міжволі апынуліся на “іншым беразе”, але засталіся беларусамі. І вось калі з'явіўся гэты метафарычны вобраз берага, прыйшла ідэя памяняць назву праекта на больш тонкую і шматпланавую.

### ЗНАЁМЫ МАТЫЎ

Музыку да стужкі стварыў таленавіты беларускі кампазітар Аляксандр Сухараў, для якога карціна — дэбютны кінапраект у прафесійнай біяграфіі.

— Гэта мой першы вопыт у кіно, таму я вельмі хваляваўся, — прызнаецца Аляксандр. — Адна справа — рабіць песні ці, напрыклад, мюзіклы, у аснове якіх ляжыць музыка. З фільмамі ўсё крыху паіншаму. Я хачу сказаць вялікі дзякуй рэжысёру, які навучыў мяне ўзаемадзейнічаць з музыкай у кіно. Хутка ў нас наладзіўся кантакт, і я зразумеў, што мы спрацуемся. Аднак узнікалі некаторыя пытанні, бо я шмат пісаў. Як высветлілася, для кіно гэтага не трэба. Затое быў выбар: створана разы ў тры больш, чым у выніку выкарысталі ў фінальнай версіі карціны. Усе кампазіцыі пісаў інтуітыўна і не глядзеў абсалютна ніякіх стужак на падобную тэматыку, каб не збівацца.

Музычная канцэпцыя праекта “На іншым беразе” — традыцыйныя народныя беларускія інструменты. Аўтары вырашылі цалкам адмовіцца ад сучасных мелодый на карысць атмасфернасці фільма.

— Вельмі важна было паказаць гістарычную эпоху, нялёгкі час. Адпаведна, гэта зусім іншы набор інструментаў, што да мяне і спрабаваў данесці рэжысёр, — распавядае кампазітар. — Працаваць было цікава, бо гэта не нейкія звычайныя папсовыя песні. Я пачынаў пісаць пасля гутаркі з Андрэем, з яго слоў трымаў у галаве сцэнарый. Спярша я ўзяўся за самую складаную і моцную тэму — тэму маці. На мой погляд, гэта вельмі душэўны кірунак, экспрэсіўны, я ім вельмі прасякнуўся і шмат уклаў у яго. Гэтая тэма, безумоўна, тычыцца кожнага, таму што яна пра сям'ю, пра любоў. Тым не менш я не магу аддаць перавагу нейкай адной мелодыі з напісаных мною для фільма. Бо, калі твая музыка кладзецца на карцінку, адбываецца цуд. Ты бачыш дзею на экране, і ўсё ўжо ўспрымаецца інакш. Нават цяпер я зусім па-іншаму гляджу любое кіно — праз прызму музыкі.

**Яўгенія ГАБЕЦ**

Здымкі праходзілі адразу на трох беларускіх рэках — Іслачы, Заранцы і Нёмане. Так аўтары стварылі вобраз адной ракі, што падзяліла краіну на два берагі.

У фільме будзе паказаны адзін з сусветных кантрабандысцкіх цэнтраў 1920-х гг. — горад Ракаў. Таксама гледачы ўбачаць на экране знаёмыя лакацыі, такія як сядзіба ў Лошыцкім парку, Заслаўе, у іншым увасабленні.

Рэжысёр Андрэй Хрулёў (у цэнтры) і выканаўцы галоўных роляў Іван Батараў (злева) і Данііл Чуп (справа)

# Як вырашыць праблемы чалавецтва?

**Культура вучыць узаемаразуменню, стварае адчуванне даверу і салідарнасці паміж людзьмі, прыносіць задавальненне і шчасце, адлюстроўвае якасць жыцця. Якую ролю адводзяць культуры нашы чытачы і які сэнс укладваюць у гэтае паняцце?**

**ІГАР**, маркетолаг:

— Культура — гэта ўсё тое ўзвышанае, што зроблена чалавекам, спалучэнне жыцця і прыгажосці, прадукт творчай працы духу і інтэлекту. Без культуры немагчымае ўдасканаленне чалавека і ўсяго грамадства ў цэлым.

Асабіста для мяне гэта тое, што адгукаецца ў сэрцы, душы. Тое, што натхняе на творчасць, прымушае думаць. Прыгожыя карціны, музыка, харэаграфія, цікавыя кнігі, фільмы, незвычайная архітэктура. Сутыкаючыся з гэтымі рэчамі, я хачу танчыць, спяваць, маляваць, пісаць вершы.

Культура ў маім разуменні таксама — норма паводзін і зносін, якая адпавядае паняццям дабрыні, сяброўства, любові, высакароднасці, справядлівасці, сумлення і маралі. І, вядома, цудоўна, калі культура абапіраецца на якасную адукацыю. На веданне гісторыі, літаратуры, музыкі, жывапісу, дасягненняў у галіне навукі, тэхнікі.

Маючы такі багаж, значна лягчэй бачыць прыгажосць навакольнага свету, разумець мастацтва, стварэць і рухацца наперад. Калі чалавек усё гэта ўспрымае, ён ніколі не будзе здзяйсняць ганебныя ўчынкі, разбураць. Хачу, каб усе людзі адчувалі сэрцам, стваралі, будавалі. Тады мы жылі б у свеце любові і прыгажосці!

**ІРЫНА**, архітэктар:

— Са словам "культура" я ўпершыню сутыкнулася ў сельскай гаспадарцы, калі пачула фразу "пасадзіць культуру". Мелася на ўвазе "апрацаваць, урабіць зямлю, на якой потым будзе пасеяна збожжавая культура".

Паколькі я з ранняга дзяцінства любіла чытаць, то маё разуменне культуры паступова мянялася. З часам я стала здагадвацца, што выраз "культурны чалавек" мае вельмі шырокі сэнс. Куды ні паглядзіш, усюды людзі нешта апрацоўваюць, займаюцца самапазнаннем, назапашваюць уменні і навыкі, увогуле, духоўна растуць. Паступова я стала прылічваць сябе да культурных асоб, бо ўмела чытаць і пісаць, разважаць, вучыцца новаму, музіцыраваць, стварэць на карысць сабе і грамадству і атрымлівала ад гэтага задавальненне.

Мая вялікая сям'я складалася з людзей розных прафесій і рознага ўзроўню развіцця. Па адной лініі былі святары, краўцы і настаўнікі, па другой — лекары, музычныя работнікі, слесары. Мяне ўсяляк натхнялі, але ніколі не навязвалі свой выбар. Думаць даводзілася самой і разбірацца ў "хачу-магу" — таксама. Шляхам спроб і памылак. Паміж прафесіямі харавога дырыжора і архітэктара — маёй любімай — былі гады працы ў грамадскім харчаванні — буфетчыцай, у сферы паслуг — маклерам, у гандлі — вяла свой бізнес. Гэта доўжылася, пакуль я не зразумела: хачу маляваць і чарціць дамы для людзей.

Сёння ведаю, што культура — гэта выхаванне душы. Калі чалавек хоча быць карысным, то павінен вучыцца ўсё жыццё і шукаць новыя шляхі. Кажуць, што натуральна, тое не брыдка. Лічу, брыдка і сумна, калі асоба нічога не ўмее і не хоча, а невуцтвам пышыцца і бравіруе.

**ХРЫСЦІНА**, эколаг:

— Культура — гэта тое, што бацькі ўкладаюць у дзяцей. Мусіць, нават тое, што перадаецца з пакалення ў пакаленне. Нейкія звычаі і традыцыі. Я падзяляю культуру на сямейную і грамадскую. Грамадская зразумелая для 99 % людзей. Гэта агульнапрынятая культура паводзін. Не шумець, не ўшчамляць правы іншых.

З сямейнай усё крыху больш складана, бо ў кожным доме яна свая. І калі бацькі ў патрэбны момант не прышчэпяць культуру дзіцяці, яна будзе страчана для яго назаўжды. Праз тое, што ў кожнай сям'і свае звычкі, новаму чалавеку бывае цяжка прыстасавацца. Напрыклад, дзяўчына выходзіць замуж. У яе радні да старэйшых звярталіся строга на "вы", падзялялі абавязкі і паважалі інтарэсы адзін аднаго.

Трапляючы ў сям'ю мужа, маладая сутыкаецца з іншым. Некаторыя рэчы падаюцца ёй дзікімі. Але, як кажуць, у чужой бажніцы свечкі не папраўляй.

Мяне выхоўвалі мама і бабуля. Яны казалі: "Хочаш тэлефон? Зарабі! Хочаш есці? Прыгатуй! Хто раней з працы прыходзіць, той наварвае на ўсю сям'ю. Калі маці хоча пачытаць, адпачыць, ёй не перашкаджаць, яна заслужыла адпачынак".

Калі чалавеку не прывілі сямейную культуру, недахопы выхавання будуць адбівацца на жыцці. Няма павагі да родных — не будзе павагі і да ўсяго грамадства.

**АЛЯКСЕЙ**, урач:

— Культура, адно з самых звыклых і быццам бы ясных паняццяў, аказваецца адначасова таямніцай за сямю пячаткамі. Галоўнае, што трэба падкрэсліць, — гэта не прывілея, а неабходны элемент існавання кожнага чалавека. Складаецца з трох кампанентаў: жыццёвыя каштоўнасці, нормы паводзін, артэфакты.

Каштоўнасці, мабыць, самае важнае звяно. Яны з'яўляюцца асновай культуры, што фарміруецца з дзяцінства. Велізарную ролю тут іграюць бацькі, настаўнікі, кнігі, якія мы чытаем, фільмы, якія глядзім, людзі, з якімі камунікуем, і грамадства, у якім жывём.

Нормы паводзін адлюстроўваюцца ў паняццях "мараль" і "маральнасць", што паказваюць, як мы павінны трымацца ў розных сітуацыях. Жыццё сярод людзей мяркуе выкананне культурных правіл. Яны прадпісваюць, як трэба паводзіць сябе ў розных месцах — у школе, дома, у гасцях, на вуліцы, у кінатэатры, у транспарце, музеі, тэатры, бібліятэцы. Кожны з нас ведае і іншыя правілы і ў пэўнай ступені адпавядае ім, звязаным з культурай знешняга выгляду (асабістая гігіена, ахайнасць, акуратнасць), з культурай зносін (ветлівасць, культура маўлення).

Канкрэтных правіл паводзін шмат. Хацеў бы вылучыць такую рысу, як адказнасць. На мой погляд, такой якасці цяпер багата каму бракуе.

Артэфакты — прадметы, здольныя несці інфармацыю аб мінулых часах, людзях, падзеях. Гэта могуць быць як аб'екты матэрыяльнага свету (чарапкі, вырабы з косці, наканечнікі стрэл), так і свету нематэрыяльнага (быліны, легенды, рэлігіі). У любым музеі можна знайсці матэрыяльныя артэфакты, якія распавядаюць пра нашых продкаў і дапамагаюць зразумець сябе.

Лічу, што культура — невычэрпная крыніца натхнення, эфектыўны інструмент самаўдасканалення кожнай асобы, яе далучэння да прыгажосці і ведаў. Гэта галоўны сродак павышэння маральнасці. Менавіта праз культуру магчымае набліжэнне да вырашэння ўсіх праблем чалавецтва.

**Ганна САКАЛОВА**

Узводзіцца арачны праём Малой брамы Крэўскага замка

Выяўлены падмурак трацяй вежы Крэўскага замка

Алег Дзярновіч, навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі

# Забытая вежа Крэўскага замка

**Сёлетні археалагічны сезон у Крэве многія ўжо назвалі сенсацыйным. І сапраўды, добра вядомы нам хрэстаматыйны вобраз самага старадаўняга мураванага замка Беларусі, верагодна, давядзецца істотна адкарэкціраваць.**

Гэтым летам навукоўцы выявілі, што насамрэч кастэль, хутчэй за ўсё, меў не дзве вежы, а тры. Аднак пра трэцюю даўно забыліся — стагоддзяў шэсць таму. Дый яна не знікла бясследна...

Пра нечаканую (або не зусім) знаходку — у чарговай гутарцы з навуковым супрацоўнікам Інстытута гісторыі НАН Беларусі Алегам Дзярновічам.

**— Літаральна год таму мы з вамі ўжо падрабязна размаўлялі пра археалагічныя даследаванні Крэва. І вось экстраардынарная нагода для новага інтэрв'ю...**

— Гэта сапраўды фенаменальная неспадзяванка, такіх вынікаў нашай сёлетняй экспедыцыі мы не чакалі. Уся вядомая нам іканаграфія Крэва, уключаючы двухсотгадовыя выданні, адлюстроўвае паўночна-ўсходні кут як разбураны. То-бок зруйнавалі яго вельмі даўно, і нават продкі не ведалі, як ён выглядаў у Сярэднявеччы. Аднак сёлетнія даследаванні — гэта важны крок, які з часам запоўніць белую пляму.

Гэта сапраўды фенаменальная неспадзяванка. Уся вядомая іканаграфія Крэва адлюстроўвае паўночна-ўсходні кут, які зруйнавалі вельмі даўно. То-бок продкі не ведалі, як ён выглядаў у Сярэднявеччы.

**— Але чаму тады вы абралі для раскопак менавіта гэты ўчастак?**

— Мы прадчувалі, што сёе-тое там знойдзем. У 2020 годзе непадалёк на сцяне былі выяўлены сляды цаглянай муроўкі. Гэта адразу насцярожыла: асноўны будаўнічы матэрыял у замку — камень, а цэгла выкарыстоўвалася толькі для важных канструктыўных элементаў. Вось першы знак таго, што ў згаданым куце ёсць шанец натрапіць на нешта цікавае.

А ўжо летась спецыялісты з геафака БДУ абследавалі замкавы двор з дапамогай геарадара. Гэтая прылада арыентавана на пошук анамалій у тоўшчы зямлі. І хаця, па словах адмыслоўцаў, такой анамаліяй можна назваць усю тэрыторыю замка, спрэс заваленую камянямі, паўночна-ўсходні кут падаўся спецыялістам асаблівым. "Тут нешта можа быць", — сказалі тады яны.

**— А ці здагадваліся вы, што менавіта?**

— Так, натуральна! Сёлета мы ставілі мэту адшукаць сляды мураванкі — каменнай пабудовы ўнутры замка. Многія ўяўляюць, нібы замак-кастэль — гэта чатырохкутнік, які атачае пусты двор, куды збягалася мясцовае насельніцтва падчас нападу ворагаў. Канешне, замкі ў цяжкую часіну прымалі люд з ваколіц, але цяпер мы з пэўнасцю можам сцвярджаць, што дзядзінцы ніколі не пуставалі — унутры было нямала пабудоў.

Сышліся эпохі. У Малой вежы канца XIV – пач. XV стст. кансервуецца таксама дот часоў Першай сусветнай вайны. Тут будзе экспазіцыя, прысвечаная тым падзеям

Прызнаюся, нашы пошукі мураванкі мелі не толькі навуковую, але і ўтылітарную мэту. Рэч у тым, што ў музея сёння няма памяшкання для розных аддзелаў і службаў. Гэта, канешне ж, стварае некаторыя праблемы. Не так даўно падобная камяніца была адноўлена ў аднатыпным Медніцкім замку. Там адкрылі касы, прыбіральні, лекцыйную залу... Усё патрэбнае. Мясцовыя ўлады падтрымалі ідэю рэканструяваць будынак і ў Крэве, калі для гэтага знойдзецца гістарычны грунт.

Таму, зрабіўшы належныя падлікі, мы заклалі разведвальную траншэю. І што б вы думалі — натрапілі акурат на сцяну! Пабачылі грунтоўны падмурак на вапнавай рошчыне. Сталі разбірацца, наколькі ён шырокі. Заклалі дадатковы квадрат — і выявілася, што шырыня падмурка вялізная, каля двух метраў.

Акрамя таго — мы выявілі нерэгулярную цэглу, з якой стваралі рэбры гатычных скляпенняў. Гэта вельмі складаная і рэдкая для таго часу тэхналогія, што ўзнікла ў нашых краях, пэўна, дзякуючы ганзейскім майстрам. Так, у Малой вежы замка скляпенняў не было, а тут на іх не паскупіліся. Стала зразумела, што мы адшукалі зусім не падмурак нейкай гаспадарчай пабудовы. Адсюль і выснова — хутчэй за ўсё, гэта невядомая раней вежа, якая мела не апошняе для замка значэнне.

Наогул, сёлетняя знаходка прымушае перагледзець нашы ўяўленні пра замкі кастэльнага тыпу. Раней здавалася, што гэта прымітыўныя чатырохкутнікі з дзвюма вежамі, але высвятляецца, што Крэўская фартэцыя была больш амбітнай і тэхнічна дасканалай, а яе стварэнне вымагала нямала рэсурсаў і майстроў.

**— Чаму ж гэтая вежа знікла, не застаўшыся ў памяці?**

— Выкажу наступную гіпотэзу: у 1433 годзе, у разгар грамадзянскай вайны за трон ВКЛ, войска князя Свідрыгайлы прарвалася ў замак менавіта ў гэтым месцы. Вежу настолькі разбурылі, што яна больш не аднаўлялася. Праём, вядома, заклалі, але вежу і браму (якая, напэўна, таксама была) ужо не адбудоўвалі.

**— Няўжо з XV стагоддзя пра існаванне той вежы ніхто нават не здагадваўся?**

— Не зусім так. Яшчэ да вайны архітэктар Абуховіч зрабіў графічную рэканструкцыю Крэўскага замка, і там трэцяя вежа пазначана. Я лічыў гэта поўнай фантазіяй, хаця, калі ўдумацца, пэўную падставу яна магла мець. У канцы 1920-х гадоў кансервавалі руіны замка, прыбіралі завалы — і, напэўна, пабачылі тыя рэшткі муроў, якія да нашага часу ўжо не дайшлі. Цягам нацысцкай акупацыі аб'ект даследавалі літоўскія архітэктары (немцы ўключылі Крэва ў генеральную округу Літва) і таксама адзначылі на плане пункцірам нейкую пабудову.

Але ўжо ў 1970-я ніякіх слядоў трэцяй вежы не праглядалася. Што нядзіўна: замак несупынна разбураецца. І тут варта нагадаць, што ўлюбёныя "рамантычныя руіны" многіх — гэта вялікая ілюзія. Немагчыма зберагчы помнік спадчыны, проста нічога не робячы.

Усходні бок двара я ўпершыню ўбачыў ужо тады, калі ён быў цалкам завалены будаўнічым друзам. Яго верхняю частку сёлета давялося здымаць каўшом экскаватара — зразумела, пад пільным археалагічным наглядам. Рыдлёўка ў такіх выпадках не дапаможа.

**— Які лёс чакае вашу сёлетнюю знаходку?**

— Перш-наперш яна ставіць перад намі новыя задачы. Трэба поўнасцю ўскрываць той кут. Таму мы ўжо рыхтуемся да раскопак у наступным сезоне. Гэтую ідэю падтрымлівае і Белрэстаўрацыя, якая вядзе працы на аб'екце, і мясцовыя ўлады Смаргоншчыны, якім ён належыць.

Што наконт перспектывы? Весці гаворку пра рэканструкцыю вежы наўрад ці магчыма: хто ведае, як яна выглядала? Можна хіба выказаць гіпотэзы — ды змясціць іх на адмысловы стэнд. Разам з музеефікаванымі падмуркамі гэта будзе яшчэ адзін цікавы экспанат таго музея, у які з цягам часу ператворыцца Крэўскі замак.

Сенсацыйная знаходка ўзняла і метадалагічныя пытанні. Чаму адкрыццё здарылася менавіта падчас рэстаўрацыйных работ — хаця навукоўцы даследавалі замак не адно дзесяцігоддзе? Пра гэта — у наступным нумары.

**Ільля СВІРЫН**
Фота Алега ДЗЯРНОВІЧА

## НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пр-т. Незалежнасці, 47,
тэл.: 8 017 2427814,
час працы: аўторак — нядзеля
з 12.00 да 20.00

• Майстар-клас мастака Руслана Сяргеева. **18 жніўня ў 18.00.**
• Выставачны праект **"Сімфонія вялікага космасу". Да 17 верасня.**
• Персанальная выстава Грэгара Данеляна **"Да Бясконцасці…". Да 17 верасня.**

УНП 192543414

## БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8,
тэл.: 8 017 2030792, 8 029 1440792,
8 017 3271166

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Мабільная экспазіцыя на культурна-спартыўным фестывалі "Вытокі" з патрыятычнай акцыяй **"Наш абавязак — памятаць"** у Касцюковічах. **19 жніўня з 11.00 да 18.00.**
• Мабільная экспазіцыя на сямейным фестывалі "Букідс. Прафесіі" ў Цэнтральным батанічным садзе ў Мінску. **20 жніўня з 10.00 да 19.00.**
• Прэзентацыя кнігі **"Так долог путь бойца, ведущий к дому". 25 жніўня ў 15.00.**
• Інтэрактыўная праграма **"Крылатыя абаронцы Радзімы"** на пляцоўцы каля легендарнага самалёта Лі-2. Папярэдні запіс. **Кожную суботу і нядзелю да верасня.**
• Запрашаем юных наведвальнікаў у прастору **"Музей для дзяцей"** — гэта ўтульная атмасфера партызанскага лесу ў спалучэнні з сучаснымі тэхналогіямі, добрымі і ўважлівымі музейнымі педагогамі. Тут праходзяць заняткі і лекцыі, майстар-класы і інтэрактыўныя праграмы для хлопчыкаў і дзяўчынак і іх бацькоў. **Прастора працуе з серады па нядзелю!**

**У продаж паступілі сертыфікаты на наведванне музея з экскурсіяй і без яе. Ёсць абанементы: "Сямейны", "Дзіцячы", "Для старшакласнікаў і дарослых".**

Падрабязнасці на сайце warmuseum.by.

УНП 100235472

## МУЗЕЙ В. К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37,
тэл.: 8 0222 650203, 8 0222 658800

• **Пастаянныя экспазіцыі.**
• Выстава **"Нацюрморт — прыгажосць у звычайным". Да 27 жніўня.**
• Art-lectorium **"Зразумелае мастацтва". Праводзіцца заўсёды.**

Падрабязней на сайце artmuseum.by альбо па тэлефонах 8 0222 650203, 8 0222 658800.

УНП 100377771

## ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г. п. Мір, Карэліцкі раён,
Гродзенская вобласць,
тэл.: 8 01596 36290,
8 01596 36270

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Квэст **"Таямніца двух куфраў". 19 жніўня ў 15.30.**
• Часовая экспазіцыя васковых фігур **"Тайная вячэра" (0+). Да 31 жніўня.**
• Выстава **"ARMATUS. Ваенна-гістарычная рэканструкцыя даспехаў і зброі" (0+).** Паўночны корпус. **Да 31 жніўня.**
• Часовая экспазіцыя **"Убачыць свет сэрцам". Да 11 верасня.**
• Аглядныя і тэматычныя экскурсіі.
• Экскурсіі з элементамі тэатралізацыі для дзяцей і дарослых.
• Экскурсія для дваіх **"Інтрыгі Купідона".**
• Квэст-экскурсія для ўсёй сям'і **"Легенды і паданні Мірскага замка".**
• Музейныя заняткі для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту: **"Святочная страва для князя па старадаўнім рэцэпце", "Асаблівасці жаночага касцюма XVIII ст.", "Арганізацыя войска і вайсковая справа ВКЛ у XVI ст.", "Печы з каробкавай кафлі XVI—XVII стст. у палацы князёў Радзівілаў".**

УНП 590201541

У нашым пазнавальна-адукацыйным Telegram-канале вы можаце даведацца больш цікавых фактаў пра беларускае мастацтва і мову, паўдзельнічаць у штодзённых апытаннях і прачытаць пра культурнае жыццё краіны. Далучайцеся!

## НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20,
тэл.: 8 017 3970163
(экскурсійнае бюро)

• **Пастаянныя экспазіцыі.**
• Экспазіцыя **"Аляксей Глебаў. Услаўляючы чалавека".** Выставачны корпус, вул. К. Маркса, 24. **Да 21 жніўня.**
• Выстава дзіцячых работ па выніках Міжнароднага міжмузейнага конкурсу **"Увесь свет — тэатр!". Да 4 верасня.**
• Экспазіцыя жывапісу Уладзіміра Пракапцова **"Пад знакам бясконцасці". Да 9 верасня.**
• Выстава твораў Мікалая Таранды **"Колер жніўня". Да 10 верасня.**
• Выстава твораў мастакоў Беларусі — юбіляраў 2023 года **"Плынь часу: жывапіс, скульптура, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва". Да 17 верасня.**
• Выстава **"Станіслаў Жукоўскі: пункт прыцягнення — сядзіба". Да 1 кастрычніка.**
• Экскурсіі: **"Самыя-самыя..." (6+), "Якога колеру зіма?" (6+), "Віды і жанры ў выяўленчым мастацтве" (6+), "Казкі Усходу" (10+), "Міфы Старажытнай Грэцыі і Рыма" (10+), "Партрэты даўнія мінулых пакаленняў..." (10+), "Пяць моў кахання" (16+), "Жаночы партрэт" (16+), "Мінск у музеі" (16+). Праводзяцца заўсёды.**

УНП 100377771

## НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19,
тэл.: 8 01770 20602, 8 01770 20660,
8 029 5518051, 8 029 1903149

**Палацавы ансамбль**
• Выстава **"Летапіс праса: разгладзім старонкі"** з прыватнай калекцыі Барыса Васільева і Юліі Ржэўскай. Малая выставачная зала. **Да 12 лістапада.**
• Выстава **"Упершыню экспанат. З фонду Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж»"**, прысвечаная 30-годдзю ўстановы і 800-годдзю горада Нясвіжа. Вялікая выставачная зала. **Да 10 снежня.**
• Праект **"Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны".** Экспазіцыйная зала першага пускавога комплексу.
• Міжнародны выставачны праект **"Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара".** У складзе пастаяннай экспазіцыі.

**Мерапрыемствы**
• Канцэрт **"Музычныя вандроўкі". 20 жніўня ў 15.00.**
• Канцэрт **"Скарбы Нясвіжа"** ў рамках адкрыцця фестывалю камернай музыкі "Даўніна і сучаснасць". **25 жніўня ў 19.00.**
• Квэсты: **"Палацавыя таямніцы", "Музычная скарбніца Нясвіжскага палаца".**
• Віртуальныя выставы: **"Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны", "Нясвіж — здабытак сусветнай культуры", "Разбуральны след вайны ў архітэктуры Нясвіжа".**
• Тэматычныя і аглядныя экскурсіі па гісторыка-архітэктурных помніках і ландшафтных парках Нясвіжа.

**Аддзел экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці (г. Нясвіж, вул. Гейсіка, 1)**
• Выстава работ сучаснага мастака Віктара Варанкевіча **"Мінулае застаецца". Да 30 кастрычніка.**

**Ратуша (г. Нясвіж, вул. Савецкая, 3)**
**Пастаянныя экспазіцыі**
• **"Тарадское самакіраванне ў Нясвіжы ў XVIII — 1-й палове XIX стст.".**
• **"Нясвіж у міжваенны час. Людзі і падзеі".**
• Калекцыя гадзіннікаў XIX—XX стст. **"Культура часу".** З фондаў музея-запаведніка.

**Мерапрыемствы**
• Квэсты: **"Безаблічны артэфакт", "Карта сямі каралеўстваў", "Музейны дэтэктыў", "Музейнае расследаванне".**
• Культурныя мерапрыемствы: **"Прыём у княгіні", "Дзень нараджэння ў ратушы"** (група да 12 чалавек ад 6 да 11 гадоў).
• Сюжэтна-ролевая развівальная праграма **"Школа шпіёнаў"** (да 25 чалавек).
• Гульня-знаёмства **"Музейка аб музеі"** (група да 25 чалавек ад 4 да 7 гадоў).
• Гульнявая праграма **"Выкрунтасы"** (група да 25 чалавек).

**Архітэктурны помнік "Слуцкая брама" (г. Нясвіж, вул. Слуцкая)**
• Часовая экспазіцыя **"Нясвіж — скрыжаванне трох хрысціянскіх рэлігій. Храмавае дойлідства". Да 30 верасня.**

Падрабязнасці на сайце niasvizh.by.

УНП 600207920

## МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

спартакомплекс "Раўбічы", Мінскі раён,
тэл.: 8 017 5074468

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Выстава **"Народнае мастацтва Беларусі XX—XXI стст.". Да 9 верасня.**
• Праграма **"Каляды ў музеі". Праводзіцца заўсёды.** Працягласць — 2—2,5 гадзіны. Папярэдні запіс абавязковы.

УНП 100377771

## МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА 1-Й ПАЛОВЫ XIX СТ."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а,
тэл.: 8 017 3637796, 8 017 3588878

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Экскурсія **"Шлях мастака Валенція Ваньковіча".** Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
• Экскурсія **"Сядзібны партрэт".** Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
• Спектакль тэатра ценяў **"Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях. Белая сарока".** Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
• Экскурсія **"Інтэр'ер шляхецкай сядзібы".** Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100377771

**Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь**

аказвае фізічным і юрыдычным асобам паслугі па рэстаўрацыі і кансервацыі ікон, твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.
Тэлефоны: **8 017 3970163, 8 025 6677819.**

УНП 192543414

# Фота тыдня

Любіце фатаграфаваць і дзяліцца цікавымі кадрамі з сябрамі? Далучайцеся да "Культуры": у новай рубрыцы "Фота тыдня" друкуюцца здымкі нашых чытачоў. Дасылайце свае творы на разгляд рэдакцыі — найлепшыя апублікуем!

Фота Уладзіміра ШЛАПАКА

# Стыкерпак

Карыстаецеся стыкерамі ў анлайн-ліставанні і хочаце папоўніць сваю калекцыю? Прапануем стыкерпак ад "Культуры"! Выказаць эмоцыі вам дапамогуць класікі беларускай літаратуры. Выбірайце самую трапную цытату — і здзіўляйце суразмоўцаў у Telegram!

2006 2010 2022

КУЛЬТУРА

Сайт: kultura-info.by
E-mail: kim@kultura-info.by

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА) Выдаецца на беларускай мове.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".

Дырэктар — КУЗНЯЦОВА Наталля Васільеўна.

Рэдакцыя газеты "Культура":

Галоўны рэдактар — КУЗНЯЦОВА Наталля Васільеўна.

Намеснік галоўнага рэдактара — ШЧУРОК Жанна Генадзьеўна.

Адказны сакратар — Галіна МАЛІНОЎСКАЯ.

Рэдактары аддзелаў — Віктар ГАУРЫШ, Яўген РАГІН.

Аглядальнікі рэдакцыі: Яўгенія ГАБЕЦ, Антон РУДАК, Ганна САКАЛОВА, Ільля СВІРЫН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ, Данііл ШЭЙКА, Зміцер ЮРКЕВІЧ, Настасся ЮРКЕВІЧ.

Рэдактар літаратурны — Мацвей ЗАЙЦАЎ.

Рэдактары мастацкія — Мікалай КАСЦЮКОЎ, Марына ПЯРКОЎСКАЯ.

Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх.

Тэлефоны: 8 017 2860797, 8 017 3345723. Тэлефон-факс: 8 017 3345741. Бухгалтэрыя: 8 017 3345735. Рэкламны аддзел: 8 017 2860797.

Падпісныя індэксы: 63875, 638752, 63879. Льготныя на паўгоддзе: 63872, 638722 (зніжка 15 %). Камплект (газета "Культура" і часопіс "Мастацтва"): 63874, 638742 (зніжка 10 %).

Рознічны кошт — па дамоўленасці.

* — матэрыял на правах рэкламы.

Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.

Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванне аўтара можа не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.

Падпісана ў друк 17.08.2023 у 16.00. Замова № 1835. Наклад 3099.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва «Беларускі Дом друку»". 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

© "Культура", 2023.